Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІПЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 141 (27999) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Ні ў грыбы, ні ў ягады!**

СТАР. 3

**Тое, што турысту трэба**

СТАР. 5

**Адкуль у калодзежы нітраты?**

СТАР. 9

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь:**

*«Мы не пераглядалі афіцыйны прагноз на 2015 год, які прадугледжвае рост ВУП на ўзроўні 100,2-100,7%. Хоць, зразумела, у розных сцэнарыях даём розныя ацэнкі. Мяркуем, што дасягнутая ў выніку дзеянняў урада і Нацбанка макраэканамічная стабілізацыя, паскарэнне расійскай эканомікі ў другім паўгоддзі, зніжэнне працэнтных ставак Беларусі ўнясуць важны ўклад у паскарэнне эканамічнага развіцця ўжо ў бягучым годзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15126,00 | ▲ |
| Еўра | 16772,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 256,48 | ▲ |
| Укр. грыўня | 687,55 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЛЮБОЎ І ГАЛУБЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Надвор'е

## ПАСВЯЖЭЛА АМАЛЬ ДА ДРЫЖЫКАЎ

### У чацвер і пятніцу максімум тэмпературы складзе 23-25 цяпла

**Сярэднясутачная тэмпература паветра на гэтым тыдні будзе нават трохі ніжэйшай за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Яшчэ ў мінулую нядзелю актыўныя атмасферныя франты выцяснулі вельмі цёплае паветра за межы нашай краіны, а з заходнімі вятрамі пачалі паступаць больш свежыя паветраныя масы з поўдня Балтыйскага мора. Таму ў аўторак удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад плюс 19 градусаў па поўначы да 26 цяпла па поўдні краіны.

Кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах дажджы і навальніцы, прагназуюцца ўдзень у сераду. Месцамі па паўночным захадзе краіны магчымае ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10-17 градусаў, удзень — 19-26 цяпла. У чацвер умовы надвор'я будуць фарміраваць сапраўды халаднаватыя і няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступяць да нас з поўдня Скандынавіі.

СТАР. 3

■ Жыллёвая нерухомасць

## ЗНІЖЭННЕ ПА ЎСІХ «ФРАНТАХ»

**За першыя пяць месяцаў года кошт «квадрата» на другасным рынку жылля зніжаўся тэмпам каля 4% за месяц. А ў чэрвені назіраюцца прыкметы стабілізацыі.**

Група кампаній «Твая Сталіца» падрыхтавала аналітычную справаздачу па рынку нерухомасці сталіцы за першае паўгоддзе. Традыцыйна цэны на жыллё беларусы лічаць у доларах, адпаведна, і сваю аналітыку спецыялісты падрыхтавалі ў прывязцы да гэтай валюты.

### РЭАЛЬНЫЯ КОШТЫ ДЫКТУЕ ПРЫГАРАД

Экспертамі было падлічана, што за шэсць месяцаў года кошт квадратнага метра ў новабудоўлях знізіўся ў сярэднім на 16%. На новабудоўлі класа «эканом» і «стандарт» зніжэнне цэн адбывалася досыць плаўна на працягу ўсяго паўгоддзя і склала 12% і 15% адпаведна. У класе «прэстыж» асноўнае зніжэнне цэннікаў прыпала на 2 квартал года і дасягнула 22%. Прадаўцы гэтай катэгорыі жылля ў новым сезоне згаджаліся толькі на мінімальныя саступкі, у надзеі дачакацца «свайго пакупніка».

У сярэднім, па выніках паўгоддзя, цана за квадратны метр у новабудоўлях Мінска склалася на ўзроўні 1439 долараў. Ва ўмовах высокай канкурэнцыі забудоўшчыкі не толькі выкарыстоўваюць розныя маркетынгавыя хады (акцыі, растэрміноўкі плацяжоў), але і згаджаюцца выкарыстоўваць сістэму зніжак нават на этапе заключэння дагавора. Памер такіх саступак дасягае 100 долараў з квадратнага метра.

СТАР. 4

# ЯКІМ БУДЗЕ ЗАЎТРА АТАМНАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ?

## Беларусь і Расія на прыкладзе БелАЭС хочуць гэта паказаць

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даклад па пытаннях падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі і прадастаўлення ўдзельнікам будаўніцтва і эксплуатацыі Беларускай АЭС жылля дзяржаўнага жылога фонду.**

«Найлепшая ў свеце станцыя будуецца, і Расія хоча на прыкладзе гэтай станцыі паказаць разам з намі, якія атамныя станцыі павінны быць у будучыні», — адзначыў Прэзідэнт. Пры гэтым ён падкрэсліў, што фарсіраваць тэрміны будаўніцтва ні ў якім разе нельга, трэба ўсё рабіць якасна і годна.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што першы энергаблок станцыі павінен быць здадзены ў 2018 годзе, другі — у 2020-м, і выказаў надзею, што гэтыя тэрміны пераносіцца не будуць.

Як было даложана Прэзідэнту, будаўніцтва БелАЭС ідзе па графіку. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб узвядзенні сацыяльных аб'ектаў для будаўнікоў і будучых удзельнікаў эксплуатацыі станцыі. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў не адрывацца ад рэалій пры забеспячэнні жыллём спецыялістаў БелАЭС, перасцярог ад «кавалерыйскіх наскокаў» у гэтым пытанні. Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць розныя варыянты, напрыклад, арэнднае жыллё, запатрабаваўшы пазбегнуць раздачы бясплатных кватэр. «Гэтага быць не павінна, ці то праз два, тры гады ці дзесяць гадоў. Трэба людзям казаць, што яны прыйдуць на вельмі перспектыўнае месца працы з добрай зарплатай. І мы будзем падтрымліваць іх у гэтым плане. Але трэба несці і сацыяльную нагрузку, і сацыяльную адказнасць. Гэтага таксама не трэба забываць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У час даклада Прэзідэнту размова ішла таксама аб падрыхтоўцы спецыялістаў для ядзернай энергетыкі, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. У гэтым пытанні Беларусь будзе арыентавацца на вопыт Расіі. «Гэта вельмі добры і перадавы вопыт у свеце, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Навучанне трэба будаваць, зыходзячы з вопыту Расіі, але рабіць гэта больш якасна і адказна».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што па аб'ектыўных прычынах у Беларусі пакуль няма магчымасці рыхтаваць аспірантаў і магістраў у сферы ядзернай энергетыкі. У краіне пакуль не сфарміравана навуковая школа па эксплуатацыі атамнай электрастанцыі. «Таму мы, выкарыстоўваючы расійскі досвед працы на атамнай станцыі расійскага ўзору, павінны ўсё-ткі арыентавацца на падрыхтоўку кадраў высокай кваліфікацыі ў Расійскай Федэрацыі. Лішніх людзей мы там рыхтаваць не будзем, таму што гэта таксама мерапрыемства не таннае, але гэта працэс перамоў», — адзначыў Прэзідэнт.

Працаваць на БелАЭС будуць у асноўным беларусы, за выключэннем ключавых спецыялістаў, якіх будуць запрашаць. «Мы іх запрашаем падчас будаўніцтва з-за мяжы, у асноўным з Расіі, паколькі гэта ўзор расійскай станцыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Звязана гэта з тым, што допуск непасрэдна да кіравання атамным рэактарам павінны мець толькі тыя спецыялісты, у якіх практычны досвед працы складае некалькі гадоў. Па меры ўводу ў эксплуатацыю станцыі расійскія спецыялісты будуць замяшчацца падрыхтаванымі ў беларускіх вну.

Падсумоўваючы, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі напрацаваны напрамкі падрыхтоўкі спецыялістаў для ядзернай энергетыкі, ёсць бачанне, як будзе наладжаны працэс і якія сродкі на гэта неабходна накіраваць.

■ Выбары-2015

# У АДКРЫТЫМ ФАРМАЦЕ

## ПАДЛІК ГАЛАСОЎ БУДЗЕ АДБЫВАЦЦА НА ВАЧАХ У ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЗІРАЛЬНЫХ МІСІЙ

**Пра гэта ў эфіры нядзельнай праграмы «Контуры» тэлеканала АНТ паведаміў сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай ЛАЗАВІК.**

«Мы ўнеслі папраўку ў закон, што назіральнік павінен бачыць, як адбываецца падлік галасоў, павінна быць створана агляднасць. Гэта патрабаванне закона», — сказаў ён.

Мікалай Лазавік выказаў думку, што на маючых адбыцца выбарах кіраўніка дзяржавы будзе значная колькасць міжнародных назіральнікаў, вялікая група БДІПЧ/АБСЕ. Ён таксама адзначыў, што традыцыйна актыўна працуюць мясцовыя назіральнікі, гэта амаль 30-40 тыс. чалавек.

Між тым на сайце Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў ужо з'явілася інфармацыя пра запрашэнне прыняць удзел у міжнародным маніторынгу падрыхтоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 11 кастрычніка 2015 года.

«Асамблея традыцыйна прымае ўдзел у маніторынгу як прэзідэнцкіх, так і парламенцкіх выбараў у Рэспубліцы Беларусь, пачынаючы з выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу 14 кастрычніка 2000 года, — паведамляе з гэтай нагоды інфармацыйны рэсурс. — Міжпарламенцкая асамблея сфарміруе і накіруе ў Рэспубліку Беларусь групу назіральнікаў, якая складзецца з дэпутатаў і парламентарыяў дзяржаў — удзельніц МПА СНД, а таксама супрацоўнікаў Сакратарыята Савета і экспертаў Міжнароднага інстытута маніторынгу развіцця дэмакратыі, парламентарызму і выканання выбарчых правоў грамадзян дзяржаў — удзельніц МПА СНД (МІМРД)».

Плануецца, што назіральнікі МПА СНД будуць праводзіць маніторынг выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не толькі ў Мінску, але і ў рэгіёнах, а таксама на замежных выбарчых участках.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# КРАМА — У КОЖНАЙ ВЁСЦЫ

## Як спажыўкааперацыі застацца запатрабаванай?

**У некаторых рэгіёнах у адрас спажывецкай кааперацыі паступае шмат нараканняў. Маўляў, адстаюць ад сучаснасці: асартымент у крамах небагаты, самі гандлёвыя пункты не дагледжаны. Лунінецкі раён, наадварот, сваім спажыўтаварыствам ганарыцца. Мясцовая кааперацыя заўсёды сярод лідараў па рэспубліцы. Пра дасягненні і планы ў гэтай галіне мы спыталіся ў намесніка старшыні Лунінецкага райвыканкама Уладзіміра КАВАЛЕВІЧА.**

***— Уладзімір Міхайлавіч, як сёння развіваецца мясцовае спажыўтаварыства?***

— Наша кааперацыя абслугоўвае ўсе 69 тысяч насельніцтва раёна, задавальняе пакупнікоў практычна па ўсіх таварных групах. Моцны штуршок дала Дзяржаўная праграма ўстойлівага развіцця вёскі на 2011-2015 гады, згодна з якой удасканальваецца гандлёвая сетка ў мястэчках. У кожнай вёсцы (за выключэннем дзвюх — там наладжана выязное абслугоўванне) адкрыта крама. Яна ёсць нават пры колькасці насельніцтва ў сто чалавек. Адзінае, што графік працы скарочаны: прыйсці па пакупкі можна з 9 да 15 гадзін. У крамах усіх аграгарадкоў зроблены капітальны рамонт, устаноўлена новае абсталяванне, дзейнічае самаабслугоўванне. Мэблю і бытавыя прыборы вясковыя жыхары атрымліваюць па заяўках: выбіраюць той жа халадзільнік па каталогу, і праз тыдзень-два рэч прывозяць пакупніку на дом. Ніхто не хоча завальваць склад. У Лунінцы і Мікашэвічах спажыўкааперацыя ўстанаўлівае «лёгкія» крамы — гандлёвыя пункты модульнага тыпу з невялікай плошчай залы (50 квадратных метраў). Падобныя крамы крокавай даступнасці зручна размяшчаць у дваровых тэрыторыях густанаселеных раёнаў горада. Як і любой арганізацыі, нам ёсць, над чым яшчэ працаваць. Напрыклад, трэба паляпшаць культуру абслугоўвання. Асартымент тавараў — пытанне, якое заўсёды будзе актуальным.

***— На вашу думку, ці ёсць у нас структура, якая магла б замяніць кааперацыю ў раёнах?***

— На сёння пакуль няма. Спажывецкае таварыства займаецца ж не толькі гандлем. Яно вядзе нарыхтоўчую дзейнасць: насельніцтва здае на перапрацоўку клубніцы, чарніцы, вішню, яблыкі, бульбу, моркву. Прыёмныя пункты створаны практычна ў кожнай сельскай краме. Запазычанасцей у нас няма, грошы людзям выплачваюць адразу. Туды ж можна прынесці і другсыравіну. Вядома, макулатуру і металалом прымаюць і камунальнікі, але гэта ўсяго 3-4 пункты на раён. Паколькі ў нас шмат населеных пунктаў знаходзіцца ў зоне радыяцыйнага забруджвання, снядзанкі школьнікаў аплачваюцца са сродкаў бюджэту. Пытанні харчавання ляжаць на спажыўкааперацыі, якая цалкам абслугоўвае сетку навучальных устаноў. Ды і што тычыцца крамаў, індывідуальных прадпрымальнікаў цікавяць толькі буйныя населеныя пункты. У вёсцы з дзвюма тысячамі жыхароў, напрыклад, ёсць пара прыватных крам і кавярня. А ў малыя мястэчкі прыватнікі не паедуць.

***— А што, калі ў райцэнтр прыйдзе вялікі рытэйл кшталту «Еўраопта»? Гэта ж сур'ёзны канкурэнт.***

— Так, на нейкі момант адток пакупнікоў адназначна будзе. Непадалёк, у Пінску, ёсць «Еўраопт». Калі ён там адкрыўся, людзі ледзь не аўтобусамі ў той гіпермаркет ездзілі. Паглядзелі, закупіліся. Зверылі чэкі. Розніца на пачку макаронаў ці крупы — некалькі сотняў рублёў. Падумалі, што не такая вялікая сума, каб набіраць за раз поўную машыну прадуктаў і рабіць дома залежы. І пакрысе ад гэтай практыкі адышлі. Можна ж усё набыць і побач з домам. У кожнай краме спажыўтаварыства прадаюцца лімоны, яблыкі, бананы. Часам нас крытыкуюць, што на халадзільнай вітрыне кожнага віду фруктаў ляжыць толькі па 5-6 штук. Але ж у вёсках шмат і не трэба. Наша кааперацыя мабільная, хутка падладжваецца пад патрэбы спажыўцоў. Паглядзела, як працуюць буйныя рытэйлы, і цяпер таксама робіць тыя ж аўкцыённыя тавары. Кожны тыдзень устанаўлівае зніжкі на пэўную групу тавараў. Таму канкурэнцыі мы не баімся і гатовы развівацца далей.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ» — МІНІСТР ПА НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЯХ

З дапамогай чаго ўдалося знізіць колькасць загінулых на пажарах да мінімуму за апошнія 15 гадоў? Як МНС плануе вырашыць праблему абмежаванага доступу да шматпавярховых дамоў з-за запаркаваных двароў? На што будзе звернута ўвага пры падрыхтоўцы да чарговага ацяпляльнага сезона?

Атрымаць адказы на гэтыя пытанні і задаць свае **міністру па надзвычайных сітуацыях Уладзіміру Аляксандравічу ВАШЧАНКУ** можна будзе **30 ліпеня** (дата правядзення змянілася) падчас «прамой лініі» ў газеце «Звязда», якая пройдзе **з 11 да 12 гадзін.** Тэлефануйце ў гэты час па нумары **(017) 287 18 71.**

Папярэдне пытанні можна пакінуць па нумары **(017) 292 38 02** ці даслаць іх на паштовую скрыню *schklennik@zviazda.by*

# ГРОШЫ НА ДЗЯЦЕЙ БЕЗ АГАВОРАК

Наймальнікаў, якія не пералічваюць дапамогу па доглядзе малых, прапануюць караць па законе

З такой прапановай выступіла днямі Генеральная пракуратура. **Начальнік аддзела па наглядзе за захаваннем правоў і свабод грамадзян упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасці прававых актаў ведамства Марына ПАПОВА** адзначыла, што неабходна дапоўніць Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і ўвесці асобную норму за непералічэнне дапамогі. Напрыклад, калі працадаўца своечасова не сплачвае сродкі ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, ён нясе адміністрацыйную адказнасць. У сітуацыі, калі арганізацыя затрымлівае грошы, прадугледжаныя на догляд малых да трох гадоў, пакарання няма. За апошні месяц толькі па адной Брэстчыне назбіраўся дзясятак скаргаў па гэтым пытанні. Атрымліваецца, што, хоць наймальнік і павінен пералічаць сацыяльную дапамогу своечасова і ў поўным памеры, паўздзейнічаць на яго ў выпадку нявыплаты складана.

— Грошы, якія ідуць на дзяцей, застаюцца ў прадпрыемства, нам іх не праводзяць, — каментуе сітуацыю **першы намеснік кіраўніка Фонду сацабароны насельніцтва Уладзімір ГРЫХУЦІК.** — Таму адказнасць за выплату дапамогі цалкам нясе наймальнік. Мы, вядома, стараемся паўплываць на нядобрасумленных працадаўцаў званкамі і просьбамі. Дзесьці пужаем праверкамі, падключаем інспекцыю па працы. Калі нашы ўгаворы не дапамагаюць, перадаем скаргі ў пракуратуру. Норма ў Адміністрацыйным кодэксе, якая б увяла адказнасць за непералічэнне дапамогі, зразумела, палегчыла б працу і фонду, і пракуратуры. У любым выпадку маладыя маці без грошай не застаюцца. Калі наймальнік затрымлівае выплаты па догляду за дзіцем больш чым на месяц, мы выдаткоўваем на дапамогу сродкі з фонду.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ПАСВЯЖЭЛА АМАЛЬ ДА ДРЫЖЫКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Раніцай і ўдзень месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 9-16 цяпла, а ўдзень яна будзе не больш як плюс 16-23 градусы, па поўдні — да 25 цяпла. Даволі халоднае для ліпеня надвор'е чакаецца і ў пятніцу, калі месцамі па паўночнай палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень магчымы навальніцы і ўзмацненне ветру парывамі да 18 м/с. Тэмпература паветра ўначы прагназуецца толькі 8-14 цяпла, а ўдзень — плюс 17-24 градусы.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў надвор'е сапраўды палепшыцца толькі на выхадныя, калі паветра пачне прагравацца. У суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5-12 цяпла, удзень чакаецца яшчэ плюс 18-23 градусы, па поўдні — да 26 цяпла. У нядзелю будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы тэмпература паветра складзе 6-15 цяпла. Праўда, удзень стане цяплець, калі чакаецца ўжо плюс 20-26 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах пачне прыпякаць і да 27-29 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ДА НАВАСЕЛЛЯ ГАТОВЫ

## У Мінску да канца ліпеня ўвядуць у эксплуатацыю 11 жылых дамоў

**Аб гэтым паведаміў старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Фёдар Рымашэўскі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«У ліпені плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 11 аб'ектаў агульнай плошчай больш як 100 тыс. кв. м. Так, па тры дамы ўвядуць у Кастрычніцкім і Першамайскім раёнах, два — у Маскоўскім, па адным у Савецкім, Фрунзенскім і Цэнтральным раёнах горада», — сказаў Фёдар Рымашэўскі.

З 35 уведзеных у эксплуатацыю ў I паўгоддзі шматкватэрных дамоў застаюцца незаселенымі дзевяць. Так, дом па вул. Убарэвіча (ЖБСК «Падшыпнік-2010»), а таксама арэндныя дамы №55 і №56 у квартале «Магістр» плануецца засяліць на гэтым тыдні, два арэндныя дамы №10 і №11 у мікрараёне Міхалова-2 — да 15 жніўня. Ключы ад кватэр у трох дамах у Фрунзенскім раёне ўласнікам уручаць з 1 па 10 жніўня. А вось дом №6 па генплане ў квартале Лебядзіны будуць засяляць пасля пагашэння запазычанасці членамі ЖБК.

Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці ў студзені—чэрвені ў сталіцы пабудавалі 7693 кватэры. Уведзена ў эксплуатацыю 554,3 тыс. кв. м агульнай плошчы жылля, што складае 74,9 працэнта ад гадавога задання. Для гараджан, якія стаяць на ўліку па паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена 173,7 тыс. кв. м агульнай плошчы, або 31,3 працэнта ад агульнага аб'ёму жылля. З выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі для гэтай катэгорыі грамадзян пабудавана 100,6 тыс. кв. м

# АДЗНАКА КІТАЙСКАМУ ПЕРАКЛАДЧЫКУ

**Медалём «За вялікі ўклад у літаратуру» Саюза пісьменнікаў Беларусі адзначаны кітайскі перакладчык Гао Ман.**

Адзнака далёка не выпадковая. Гао Ман, які нарадзіўся ў 1926 годзе ў Харбіне, здаўна прывязаны да славянскіх літаратур. І поруч з перакладамі рускай і ўкраінскай паэзіі, прозы, публіцыстыкі ён працаваў над пераўвасабленнем на сваю родную мову і беларускага прыгожага пісьменства. Яшчэ ў 1958 годзе Гао Ман разам з Гэ Баоцюанем пераклаў на кітайскую мову зборнік паэзіі Максіма Танка.

І сёння, нягледзячы на паважаны ўзрост, перакладчык уважлівы да беларускага мастацкага свету. У госці да яго ў Пекін завітваюць беларускія літаратары, журналісты. А параўнальна нядаўна Гао Ман выступіў у газеце «Жэньмінь жыбаа» з артыкулам пра беларуска-кітайскія літаратурныя сувязі. Застаецца нагадаць, што перакладчык — яшчэ і аўтар графічных партрэтаў беларускіх пісьменнікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, Алеся Адамовіча, Навума Гальпяровіча і інш.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

■ Будзь у курсе

# НАВАТ У ГРЫБЫ НЕЛЬГА

## Калі ў вашым рэгіёне забаронена наведваць лес, ісці туды не варта ні па якой прычыне

**Летняя спёка пайшла на спад, але небяспека лясных пажараў застаецца. Ледзь не кожны дзень з'яўляюцца навіны аб ліквідацыі ўзгаранняў у розных рэгіёнах краіны, часам — вельмі буйных. Напрыклад, на пачатку ліпеня на мяжы Брэсцкай і Гомельскай абласцей гарэла больш за 120 гектараў лесу. На тушэнне было накіравана 123 чалавекі і 23 адзінкі тэхнікі, праца ўскладнялася тым, што агач пажару знаходзіўся ў цяжкадаступным для машын масіве. Менавіта для таго, каб зменшыць рызыку ўзнікнення чарговых пажараў, традыцыйнай летняй мерай становіцца забарона на наведванне лясоў. Але многія грамадзяне яго папросту ігнаруюць.**

З пачатку летняга сезона толькі ў Мінскай вобласці за парушэнне правілаў карыстання лесам былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці амаль 200 чалавек. 178 панеслі адказнасць за невыкананне правілаў пажарнай бяспекі і наведванне лясоў у забаронены для гэтага час. Яшчэ 13 чалавек атрымалі штрафы за развядзенне агню ў непрызначаных месцах.

— Забарона на наведванне лясоў азначае, што знаходзіцца там нельга ні па якой прычыне, — каментуе **начальнік аддзела аховы, абароны лесу, палявання і паляўнічага турызму Мінскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Сяргей СЯНЬКЕВІЧ**. — Нават калі чалавек пайшоў у грыбы ці ў ягады або проста выбраўся «падыхаць паветрам», гэта кваліфікуецца як адміністрацыйнае правапарушэнне. Адзінае выключэнне з правіла — службовы транспарт вытворчых арганізацый. Адносна раскладвання вогнішчаў усё проста: ёсць спецыяльна абсталяваныя для гэтага месцы.

Цяпер забарона ў большасці рэгіёнаў знята. У Мінскай вобласці яе дзеянне працягваецца

толькі ў Дзяржынскім, Капыльскім, Любанскім, Старобінскім, Стаўбцоўскім, Уздзенскім і Чэрвеньскім раёнах.

Парушальнікі, якіх затрымліваюць у забароненым для наведвання лесе, могуць атрымліваць штрафы да дваццаці пяці базавых (цяпер — 4 500 000 рублёў), калі іх дзеянні не прынеслі шкоды, і да пяцідзесяці базавых (9 000 000 рублёў), калі дзяржава панесла страты. Развядзенне агню ў не прызначаных для гэтага месцах караецца папярэджаннем або штрафам да дванаццаці базавых велічынь (2 160 000 рублёў).

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Крымінал, здарэнні

## МЯЖУ ПАРУШЫЎ... ПАРАПЛАН

**26-гадовы жыхар Беластока пераляцеў польска-беларускую дзяржаўную мяжу на безматорным апараце — параплане.**

Гродзенскія пагранічнікі затрымалі маладога чалавека ў раёне вёскі Нязбодзічы Свіслацкага раёна. Пры сабе ў грамадзяніна Польшчы меліся радыёстанцыя, смартфон, ліхтар, сродкі аказання першай медыцынскай дапамогі, таблеткі без прамысловай упакоўкі, вадзіцельскае пасведчанне, банкаўскія пластыкавыя карткі, грошы. Ён паведаміў, што страціў арыентацыю на мясцовасці ў паветры. Па факце парушэння дзяржаўнай мяжы з выкарыстаннем безматорнага лятальнага апарата распачалі адміністрацыйны працэс.

## «МЁРТВАЯ ДУША» НА ФЕРМЕ

**Супрацоўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі вывелі на «чыстую ваду» загадчыцу малочнатаварнай фермы аднаго з сельгаскааператываў Лідскага раёна.**

Жанчыне прыйдзецца адказваць па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса Беларусі: за крадзеж і злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі. Згодна з інфармацыяй прэс-службы УУС Гродзенскага аблвыканкама, кіраўніца фіктыўна ўладкавала на працу жывёлаводам сваяка і шляхам унясення несапраўдных звестак у табелі ўліку рабочага часу здзейсніла крадзеж 140 мільёнаў рублёў. Мужчына быццам працаваў на ферме з сакавіка 2013-га па красавік 2015 года. А на самой справе работу за «мёртвую душу» выконвалі па незаконных указаннях загадчыцы яе падначаленыя, не атрымліваючы за гэта ні капейкі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## «СЭКАНОМІЎ» НА ПАДАТКАХ

**Навукай на будучыню стала для кіраўніка магілёўскага таварыства з абмежаванай адказнасцю «УютСтройсервис» спроба разбагацець на падатках. Падчас праверкі дакументацыі супрацоўнікамі фінансавай міліцыі высветлілася, што больш як 683 атрыманыя прадпрыемствам мільёны не знайшлі адлюстравання па бухгалтарскім уліку.**

— Установлена, што ў перыяд з верасня 2007 года па студзень 2010 года і з мая 2012 года па студзень 2013-га дырэктар таварыства наўмысна схаваў своечасова атрыманыя акты здачы-прыёмкі выкананых рамонтных і будаўнічых работ па заказах ІП і юрыдычных асоб, што прывяло да заніжэння выручкі і нявыплаце ў бюджэт падаткаў у суме 115,6 мільёна рублёў, — паведамілі ва ўпраўленні Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці.

У дачыненні да дырэктара распачата крымінальная справа. У кошт пагашэння нанесенай шкоды накладзены арышт на аўтамабілі «Нісан Мікра», «Інфініці QX 56» і бытавую тэхніку абвінавачанага. Змякчаючай акалічнасцю стала тое, што сваю віну дырэктар таварыства прызнаў цалкам і кампенсаваў прычыненую дзяржаве шкоду. За ўхіленне ад выплаты ён атрымаў штраф у памеры 500 базавых велічынь — 75 мільёнаў рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Наўздагон

# ШАГАЛУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

**У Віцебску тры дні святкавалі 100-годдзе з дня вяселля Марка Шагала і Бэлы Розенфельд і правялі юбілейныя XXV міжнародныя Шагалаўскія чытанні. Арганізатары не выключаюць, што пілотны культурны праект «Вясельная феерыя «Закаханыя над горадам» з часам стане яшчэ адным турыстычным брэндам.**

Падчас цырымоніі адкрыцця праекта на плошчы Тысячагоддзя быццам бы ажылі палотны майстра. У прыватнасці, цыркачы, якія ігралі ролю закаханых, літаральна ляталі над горадам...

Ажыццявілі фотапраект «Гораду Марка Шагала прысвячаецца...». Потым фота расійскіх фатографаў будуць паказаны ў Маскве... Працавала выстава-кірмаш «Шагалаўскі Віцебск». Адбылася прэзентацыя вясельных аўтамабіляў «Вясельны дыліжанс»...

У дварыдома, які належаў сям'і Шагала, падчас сімвалічнага іўдзейскага шлюбнага абраду яблыку недзе было ўпасці. Цікава, што правёў яго сапраўдны рабін. Надоўга запомніцца і дэманстрацыя калекцыі вясельных убораў, майстар-клас па вясельным вальсе, светлавое шоу...



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

У юбілейных Шагалаўскіх чытаннях бралі ўдзел даследчыкі біяграфіі і творчасці мастака з Беларусі, ЗША, Японіі, Расіі, і Латвіі.

— За ўсе гады правядзення чытанняў геаграфія ўдзельнікаў была вельмі разнастайнай. Складана сказаць, прадстаўнікі якіх краін яшчэ не былі ў Віцебску. Сёлета прыехалі 15 дакладчыкаў, — адзначыла **Ірына ВОРАНАВА, дырэктар музея Марка Шагала ў Віцебску**.

А **гісторык Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ** падкрэсліла ўнікальнасць віцебскіх чытанняў:

— 25 гадоў — сур'ёзны тэрмін для навуковай канферэнцыі. Больш за тое, канферэнцыі манаграфічнай, прысвечанай аднаму чалавеку. Цяжка наогул уявіць, як такое магчыма: на працягу чвэрці стагоддзя кожны год Віцебск збірае даследчыкаў, і іх не становіцца менш. Я падлічыла, што за ўсе гады прачытана каля 260 дакладаў. Цікава, што былі і выязныя чытанні — у польскім горадзе Люблін падчас шагалаўскага фестывалю.

Улада і надалей будзе спрыяць правядзенню навуковага мерапрыемства.

— 25 гадоў чытанням — на маю думку, гэта толькі пачатак. І ўпэўнены, што яны застануцца назаўжды. Можа быць, будуць праводзіцца раз на 2 гады або штогод. Але ў любым выпадку яны будуць, — запэўніў прысутных **Пётр ПАДГУРСКІ, намеснік старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта**.

Цікава, што ў дні святкавання юбілею шлюбу Шагала і яго музы ў Віцебску заручыліся 24 маладыя пары.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# ЗНІЖЭННЕ ПА ЎСІХ «ФРАНТАХ»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер аналітыкі падрыхтаванага дакумента адзначаюць чатыры галоўныя моманты, якія характарызуюць структуру існуючай прапановы па лініі новабудоўляў. Такім чынам, 80% прадстаўлена каркасна-блокавымі дамамі, 13% — панэльнымі. Сёння каля 33% усіх прапанаваных аб'ектаў-новабудоўляў рэалізуюцца па схеме куплі-продажу. У эксплуатацыю зараз здадзена або знаходзіцца на этапе здачы 46% новабудоўляў. Па колькасці новых дамоў на першасным рынку жылля лідзіруюць Першамайскі, Цэнтральны і Фрунзенскі раёны горада (24%, 20% і 17% рынку новабудоўляў адпаведна).

**Кіраўнік аналітычнага аддзела групы кампаній «Твая Сталіца» Надзея ПІЧУХА** адзначае, што ў гэтым паўгоддзі актыўны ўплыў на зніжэнне коштаў у галоўным мегаполісе краіны аказвае павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва па дэмакратычных цэнах у бліжэйшых прыгарадах Мінска. Мінімальны кошт квадратнага метра ў новабудоўлях прыгарада склаў 800 долараў у жыллёвым кааператыве «Вясёлка», у той час як сярэдні кошт прыгарадных новабудоўляў складае 1026 долараў за «квадрат».

**У сярэднім, па выніках паўгоддзя, цана за квадратны метр у новабудоўлях Мінска — 1439 долараў.**

## НЯНОВАЕ ЖЫЛЛЁ — МІНУС 17%

**Намеснік дырэктара па продажах агенцтва «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА** паведамляе, што другасны рынак жылля аператыўна адрэагаваў на змяненне эканамічнай сітуацыі ў першым паўгоддзі 2015-га. Нестабільнасць на валютным рынку і карэкціроўка рэальных даходаў жыхароў сталіцы пацягнулі за сабой зніжэнне кошту жылля. А ў выніку сярэдні кошт квадратнага метра за гэты час упаў на 17,4%, або на 270 долараў. Калі ж аналізаваць зніжэнне коштаў у адносінах да мінулага лістапада, то яно склала 20,4%, ці 328 долараў з «квадрата». На працягу лютага—мая цана здзелак знізілася ў сярэднім на 4% штомесяц, і толькі ў чэрвені сітуацыя пачала стабілізавацца, калі кошты знізіліся ўсяго на 2%. Аднак пра рэальную стабілізацыю гаварыць яшчэ рана, лічыць спецыяліст. Аб'ём прапановы на другасным рынку жылля вырас у сярэднім на 25% у адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года. Пры гэтым аб'ём праведзеных здзелак змяняўся штомесяц неаднолькава, але ў сярэднім застаўся на ўзроўні 2014 года. Нязвыкла вялікі аб'ём прапановы на рынку сёння працягвае аказваць уплыў на зніжэнне кошту жылля. У выніку ў чэрвені цана квадратнага метра ў кватэрах стандартных спажывецкіх якасцяў (ССЯ) па сталіцы склала 1277 долараў. Дарэчы, цяпер гэты параметр па аднапакаёвых кватэрах складае 1338 долараў, па двухпакаёвых — 1260 долараў, трохпакаёвых — 1190 долараў за квадратны метр.

**Сярэдні кошт арэнды аднапакаёвак — 233 долары ў месяц, двухпакаёвых — 324, трохпакаёвых — 392.**

Гатовыя да пражывання кватэры (са свежым рамонтам і мінімальным наборам мэблі) прадаваліся ў сярэднім з разліку 1469 долараў за «квадрат». Кошт квадратнага метра ў такіх кватэрах знізіўся на 24% у адносінах да снежня 2014-га, або на 470 долараў за 1 квадратны метр. Тут спадарыня Кудзелка адзначае, што летась сярэдняя розніца паміж кватэрамі ССЯ і гатовымі да пражывання жылымі памяшканнямі складала 250-270 долараў за квадратны метр. А вось сёлета адбылося цэнавае збліжэнне гэтых сегментаў. Цяпер розніца паміж імі складае 180-200 долараў за квадратны метр.

У першым паўгоддзі найбольшая колькасць здзелак на другасным рынку мегаполіса заключана ў Фрунзенскім і Маскоўскім раёнах Мінска — 26% і 16% ад усяго аб'ёму адпаведна. Сярэдні кошт квадратнага метра кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў у Фрунзенскім раёне склаў 1290 долараў, у Маскоўскім — 1307 долараў. Самымі даступнымі па кошце кватэры былі ў Партызанскім і Заводскім раёнах сталіцы. Сярэдняя цана кватэр у гэтых раёнах па выніках чэрвеня сфарміравалася на ўзроўні 1130 долараў за квадратны метр.

## АРЭНДА ФІКСУЕ ЦЭНАВОЕ «ДНО»

Спецыялісты агенцтва нерухомасці адзначаюць, што праблемы ў эканоміцы непазбежна адбіваюцца ва ўсіх сегментах жыллёвага рынку. Не абышлі яны і рынак арэнды. Змяненне каціроўкі курсу замежнай валюты пры ранейшым узроўні зарплаты прывёў да зніжэння стаўкі арэнднай платы. Уласнікі вымушаны ісці на саступкі, каб прыцягнуць або ўтрымаць арандатараў.

Па выніках чэрвеня сярэдні кошт арэнды аднапакаёвых кватэр склаў 233 долары ў месяц, двухпакаёвых — 324 долары, трохпакаёвых — 392 долары. Экспертамі было падлічана, што ў параўнанні з мінулым снежнем стаўка арэнднай платы знізілася ў сярэднім на 22%. Найбольшае зніжэнне прыпала на самыя запатрабаваныя аднапакаёвыя кватэры. Цэннікі арэнды на такія памяшканні паменшалі адразу на 31%, ці на 104 долары. Тут трэба заўважыць, што ў маі намецілася некаторая стабільнасць на рынку, а ў чэрвені стаўкі арэнды зніжаліся мінімальна.

Агучаныя кошты арэнды прадугледжваюць наяўнасць у кватэры базавага набору мэблі і бытавой тэхнікі. І, вядома ж, каб кватэра знаходзілася ў добрым стане. Камунальныя плацяжы, як правіла, аплачваюцца арандатарамі, але ў сітуацыі перавышэння аб'ёму прапановы над попытам усё больш арандатараў настойваюць на ўключэнні кошту камунальных плацяжоў у арэндную плату. Асабліва гэта актуальна для кватэр, якія прапануюцца на рынку па цане, вышэйшай за сярэднерыначную.

Сур'ёзныя змены, якія адбыліся на рынку арэнды за апошнія паўгода, зрабілі яго больш дэмакратычным і цывілізаваным. Ранейшы «дыктат» аднаго з бакоў цяпер адсутнічае, і кліенты па здзелцы арэнды ўжо размаўляюць адзін з адным «на роўных». Сёння базавы набор мэблі можна ўжо сустрэць у кожнай другой кватэры, а бытавой тэхнікі — у кожнай трэцяй. Усё гэта дазваляе казаць, што рынак вырас як у колькасным, так і ў якасным разрэзе.

**Актыўны ўплыў на зніжэнне цэн у Мінску аказвае павелічэнне будаўніцтва ў бліжэйшых прыгарадах.**

Найбольш дарагімі раёнамі Мінска і сёлета заставаліся самыя ліквідныя месцы. Гэта Стары горад, праспект Пераможцаў і вуліца Заслаўская, раён вуліцы Захарава — плошча Перамогі. Мінімальны кошт арэнды аднапакаёвай кватэры ў гэтых раёнах складае ад 300 долараў, а двухпакаёвай — ад 400 долараў за месяц. У кароткатэрміновай перспектыве чакаецца захаванне гэтых мінімальных стаўвак арэнды, аднак у другой палове жніўня яны могуць і падрасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*


## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

06 августа 2015 года на 15-ом открытом аукционе проводит 12-ый от 02.07.2015 и 14-ый от 23.07.2015 повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| № лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 137 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 147283 дв.603819 1990 г. 4 кат. 78011 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 48 000 000 | 4 800 000 |
| 138 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 113116 дв. 368076 1988 г. 4 кат. 47496 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 192 | Грузовой Урал-4320-0010 ш. 040589 дв. 766959 1985 г. 4 кат. 17288 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 195 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш.141654 дв.564524 1990 г. 4 кат. 51998 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 196 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 113127 дв. 368698 1988 г. 4 кат. 50927 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 198 | Грузовой Урал-4320-0710 ш. 087429 дв.179924 1987 г. 4 кат. 62187 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 199 | Грузовой Урал-4320-0710 ш. 095116 дв. 237660 1988 г. 4 кат. 72285 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 201 | Грузовой Урал-43202 ш. 068907 дв. 022515 1987 г. 4 кат. 46105 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 202 | Грузовой Урал-43202 ш. 061117 дв. 958303 1986 г. 3кат. 28142 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 203 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 036171 дв. 725654 1985 г. 4 кат. 23318 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 204 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 170382 дв. 737783 1991 г. 3 кат. 39133 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 205 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н. 62Т4449БЛ р. 113310580 дв. 7W0662E 1977 г. 3 кат. 122 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 206 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н Е06ТБЛ658 р. 11431044 дв. 7AG0327E 1987 г. 3 кат. 139 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 207 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 62Т4451БЛ р. 11331077 дв. 7W0665E 1977 г. 3 кат. 119 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 208 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 67Т4842БЛ р. 113312575 дв. 7W0786E 1977 г. 3 кат. 114 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 209 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 92Т2404БЛ р. 11331463 дв. 7W0982E 1977 г. 3 кат. 125 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 210 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 71W7091БЛ-2 р. 11351858 дв. 7У10106E 1979 г. 3 кат. 183 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 211 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 5BR1262БЛ р. 1141244 дв. 7AE1138E 1985 г. 3 кат. 186 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 212 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н Е04ТБЛ508 р. 11430644 дв. 7AG0293E 1987 г. 3 кат. 166 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 213 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н Е04ТБЛ518 р. 114306530 дв. 7AG0243E 1987 г. 3 кат. 149 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 214 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н Е04ТБЛ514 р.11430646 дв.7AG0272E 1987 г. 3 кат. 161 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 215 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 53Т4538БЛ р. 11331056 дв.7N0525E 1977г. 3 кат. 126 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 216 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 53Т4520БЛ р. 11331043 дв. 7N04111E 1977г. 3 кат. 135 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 217 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 62Т4420БЛ р. 11331038 дв.7W06109E 1977г. 3 кат. 112 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 218 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 67Т4487БЛ р. 11330678 дв.7W078E 1977г. 3 кат. 139 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 219 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 67Т4850БЛ р. 11331273 дв.7W081E 1977г. 3 кат. 130 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 220 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 80Т4848БЛ р. 11331271 дв.7W0814E 1977г. 3 кат. 441 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 221 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 62Т4419БЛ р. 11331048 дв.7W0132E 1977г. 3 кат. 1137 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 222 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н Е08ТБЛ791 р. 11431451 дв.7AG0728E 1987г. 3 кат. 154 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 223 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 62Т4438БЛ р. 11331057 дв.W058E 1977г. 3 кат. 126 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 224 | Гусеничный тягач АТС-59Г з. н 53Т4690БЛ р. 11331044 дв.7W0549E 1977г. 3 кат. 121км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» № 123 от 01.07.2015 г.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**


■ Ураджай-2015

## МІЛЬЁН. І ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК

**Беларускія аграрыі перайшлі праз рубеж у адзін мільён ва ўборцы збожжавых і зернебабовых культур. Згодна з інфармацыяй Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, на гэты момант намалочана каля 1 млн 242 тыс. тон збожжа, з якіх 415 тыс. тон — аграрыямі Гомельскай вобласці, каля 365 тыс. тон — Брэсцкай.**

У Магілёўскай і Мінскай абласцях намалочана 168 і 167 тыс. тон збожжа адпаведна, у Гродзенскай — 109 тыс. тон, у Віцебскай, якая апошняй уключылася ў жніво, — усяго каля 18 тыс. тон. Збожжавыя і зернебабовыя ўбралі з 396 тыс. га, а гэта крыху менш за пятую частку ад агульнай плошчы — 17,6%. Лідарам на 27 ліпеня з'яўляецца Гомельская вобласць, дзе ўбрана амаль 52% плошчаў. У сярэднім з 1 га сёлета аграрыі ўбіраюць 31,4 ц збожжа, што, аднак, на 7,9 ц менш, чым летась. Таксама ў Беларусі завяршаецца ўборка азімага ячменю, якога ўбралі з 94% плошчаў (7,3 тыс. га з 7,8 тыс. га). Намалочана пры гэтым 32,2 тыс. тон пры сярэдняй ураджайнасці 44,2 ц/га (гэта на 3,5 ц больш, чым летась). У Гродзенскай вобласці ўраджайнасць азімага ячменю сёлета вышэй на 7 ц, чым у мінулым годзе. Таксама аграрыі ўбралі больш за 61% азімага рапсу і лён з 40% плошчаў, працягваецца нарыхтоўка травяных кармоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Фінансавы выдатнік

# ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ГРАШОВАГА ПЕРАВОДУ

## Банкі абавязалі паведамляць Нацбанку аб грашовых пераводах фізічных асоб

**Нацыянальны банк краіны распрацаваў інструкцыю аб грашовых пераводах. Дакумент апублікаваны на Нацыянальным прававым партале і ўступае ў сілу сёлета з 7 верасня.**

### ПА АДНОЛЬКАВЫХ ПРАВІЛАХ

Інструкцыя вызначае парадак ажыццяўлення камерцыйнымі банкамі, нябанкаўскімі крэдытнымі арганізацыямі грашовых пераводаў у беларускіх рублях і замежнай валюце праз сістэмы грашовых пераводаў. Згодна з гэтым дакументам, банкі, якія з'яўляюцца ўладальнікамі і ўдзельнікамі сістэм грашовых пераводаў, не пазней за 15 каляндарных дзён да моманту пачатку ажыццяўлення такіх пераводаў павінны падаць у Нацбанк копіі дакументаў, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы банка як уладальніка (ўдзельніка) сістэмы грашовых пераводаў, копіі дакументаў, у якіх распісаны правілы сістэмы пераводаў, а таксама інфармацыю аб структуры гэтай сістэмы з указаннем наймення, месцазнаходжання разліковага цэнтра, схем перадачы інфармацыйных паведамленняў і руху грашовых сродкаў.

### ВЫКЛЮЧНА ПА АЛГАРЫТМЕ

Інфармацыя пра банкі, якія аказваюць паслугі па грашовых пераводах, будзе размяшчацца на сайце Нацбанка. Акрамя таго, банкі «штоквартальна не пазней 13-га чысла месяца, наступнага за справаздачным перыядам, накіроўваюць у галоўны фінансавы рэгулятар інфармацыю аб адпраўленых і выплачаных грашовых пераводах, умовах і спосабах іх ажыццяўлення паводле інфармацыйнай тэхналогіі, распрацаванай Нацыянальным банкам».

Інструкцыя прадугледжвае, што ажыццяўляць пераводы можна не толькі з дапамогай наяўных грошай, але таксама і з дапамогай спісання грашовых сродкаў з рахунку адпраўшчыка і залічэння грошай на рахунак атрымальніка; акрамя таго, для выканання такой аперацыі можа быць выкарыстана дыстанцыйнае банкаўскае абслугоўванне.

### «ШЭРЫ» КЛІЕНТ НЕ ПРАСКОЧЫЦЬ

Дакумент распісвае таксама, якія звесткі абавязкова павінны прадаставіць адпраўнік і атрымальнік грашовага пераводу. Так, цяпер у рэквізітах фізічнай асобы паказваюцца: прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), месца жыхарства і (або) звесткі дакумента, які сведчыць (пацвярджае) асобу фізічнай асобы або, калі грашовыя сродкі спісваюцца з рахунку ці залічваюцца на рахунак фізічнай асобы, нумар рахунку ў банку, які з'яўляецца ўладальнікам і (або) удзельнікам сістэмы грашовых пераводаў. Калі для ажыццяўлення грашовага пераводу выкарыстоўваецца банкаўская плацежная картка, замест нумара рахунку дапускаецца пазначаць у заяве яе нумар.

### МОГУЦЬ І АДМОВІЦЬ

Інструкцыяй прадугледжана, што банк мае права адмовіць асобе, якая падпісала заяву на атрыманне пераводу пры непадачы звестак і дакументаў, неабходных для ідэнтыфікацыі гэтай асобы у выпадках і парадку, прадугледжаных Законам Беларусі «Аб захадах па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Новыя тэхналогіі

# «BELARUS N» — ТОЕ, ШТО ТУРЫСТУ ТРЭБА

## МАРШРУТЫ НА КАРЦЕ І Ў РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

**Беларусь з'яўляецца папулярнай транзітнай тэрыторыяй, бо менавіта праз нас праходзяць шляхі з Еўропы ў Азію і назад. А гэта прадугледжвае вялікую колькасць патэнцыйных турыстаў, здольных прынесці прыбытак краіне. Застаецца іх толькі зацікавіць, каб адмовіліся ад ужо існуючых маршрутаў на карысць новых, якія пакажуць Беларусь сучаснай краінай з багатай гісторыяй і традыцыямі. Для гэтага, з аднаго боку, плануецца стварыць тэматычныя шляхі і зручны візавы рэжым, з другога — Нацыянальны інтэрнэт-партал, які дазволіць «узаемадзейнічаць» з маршрутамі анлайн. Вось і атрымліваецца, што арганізоўваць турыстычную інфраструктуру трэба адразу ў дзвюх рэчаіснасцях.**

### ПАДАРОЖЖА ПАЧНЕЦЦА З ЗАПРАЎКІ

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара «Беларуснафты» Сяргея КАМОРНІКАВА,** больш за 350 тысяч аўтамабілістаў штодзённа наведваюць сетку АЗС. Менавіта таму на 545 запраўках плануецца стварыць інфармацыйныя і рэсурсныя цэнтры для турыстаў. А ўжо адтуль і пачнецца падарожжа па тэматычным маршруце. Яго каардынатарамі могуць выступаць любыя арганізацыі, гатовыя наладзіць працу і прасоўваць яго. Напрыклад, калі вы ўладальнік сядзібы ці прыдарожнага сэрвісу, то можаце скаардынавацца з праграмай, якая, дарэчы, называецца «Belarus N», і прапанаваць свае паслугі і маршрут, што будзе прывабны для наведвальнікаў гістарычным і культурным бокам. Гэта павінна стаць самаакупным бізнес-праектам і спрыяць умацаванню іміджу краіны і кампаніі-арганізатара.

Фота БЕЛТА.

«Усе пункты маршруту будуць аб'яднаны адной ідэяй. Мы хочам, каб маршрут быў інтэрактыўным і цікавым для дарослых і дзяцей. Для гэтага і патрэбна адпаведная тэматыка і ўнікальны сэрвіс. Сёння ўжо некалькі дзясяткаў маршрутаў у стадыі актыўнага праектавання», — адзначыў Сяргей Каморнікаў.

Праект дазволіць аб'яднаць намаганні турфірмаў і мясцовай улады. Яго анансавалі сёлета ў канцы мая. За гэты час ён ужо паспеў атрымаць падтрымку на дзяржаўным узроўні. Распрацоўшчыкі чакаюць, што праект уключаць у Дзяржаўную праграму па развіцці турызму ў Беларусі на 2016-2020 гады. Цяпер ужо рыхтуецца 16 такіх маршрутаў. Чакаецца, што першыя з іх стартуюць з выкарыстаннем інтэрнэт-платформы ўжо сёлета восенню. Налета іх колькасць дойдзе да 50.

### ПАРТАЛ У ІНТЭРАКТЫЎНЫ СВЕТ

Аб'яднацца ўсім маршрутам дапаможа адзіны інтэрнэт-партал, які стане інфармацыйным фундаментам праграмы. Ён дазволіць браніраваць і аплачваць паездку, размяшчацца ў гасцініцах або сядзібах, пакідаць водгукі аб сэрвісе. Акрамя таго, прадугледжана спецыяльная мабільная праграма, якая павінна спрасціць працу з парталам і дапамагчы бачыць сваё месцазнаходжанне на смартфоне.

Па словах **намесніка міністра спорту і турызму Міхаіла ПАРТНОГА**, стварэнне нацыянальнага інтэрнэт-партала прадугледжана канцэпцыяй Дзяржаўнай праграмы развіцця турызму ў Беларусі на 2016-2020 гады.

«На жаль, Беларусь у турыстычным свеце не зусім вядома, але за кошт партала гэта можна выправіць. Ён будзе выконваць дзве асноўныя функцыі. Гэта інфармацыйная, стварэнне станоўчага іміджу дзяржавы, а таксама падача нашага турыстычнага прадукту ў прыгожай упакоўцы, а нам ёсць што прапанаваць патэнцыйнаму спажыўцу», — растлумачыў Міхаіл Партны.

Гаворачы аб праграме «Belarus N», намеснік міністра звярнуў увагу, што праект таксама ўпісваецца ў канцэпцыю дзяржпраграмы развіцця турызму на бліжэйшыя пяць гадоў.

«У канцэпцыі праграмы адзначана, што дзяржава будзе падтрымліваць уязны і ўнутраны турызм. Праект «Belarus N» — гэта мініяцюра нашай новай праграмы развіцця турызму. Таму Мінспорту падтрымлівае гэтую ідэю і дапаможа практычна яе рэалізаваць», — адзначыў Міхаіл Партны.

Як стала вядома, гэта праграма будзе гатова праз паўтара месяца. У ёй будуць раздзелы, якія тычацца кадравай палітыкі, маркетынгу, мерапрыемстваў па нарматыўным прававым забеспячэнні. Яна будзе пабудавана на аснове Генеральнай схемы размяшчэння зон і аб'ектаў аздараўлення, адпачынку і турызму Беларусі да 2030 года. У аснову будзе закладзена развіццё лакальных зон — турысцка-рэкрэацыйных паркаў, курортных тэрыторый.

### ТРЫ ДНІ БЕЗ ВІЗЫ

Адным з крокаў, які дапаможа прыцягнуць турыстаў, з'яўляецца ўвядзенне бязвізавага рэжыму ўезду на тры дні. Па словах **выканаўцы абавязкаў дырэктара Нацыянальнага агенцтва па турызме Рыгора ПАМЯРАНЦАВА,** гэтае пытанне ўжо знаходзіцца на стадыі абмеркавання, і ў любым выпадку ў яго ёсць вялікі патэнцыял, які можна бачыць на прыкладзе іншых краін. Ён таксама нагадаў, што нядаўна падпісаны ўказ аб магчымасці бязвізавага знаходжання грамадзян Кітая ў Беларусі да трох сутак.

«Над краінай кожную хвіліну пралятае вялікая колькасць лайнераў з замежнымі турыстамі, бізнесменамі на борце. У нас ёсць выдатны аэрапорт — трансферны вузел — і авіякампанія. Калі прыцягнуць у якасці турыстаў хаця б 3-4% авіяпасажыраў, мы будзем больш эфектыўна выкарыстоўваць транзітны патэнцыял», — дадаў Рыгор Памяранцаў.

У грамадзян іншых краін у гэтым выпадку з'яўляецца магчымасць не проста чакаць свайго вылету ў аэрапорце або адбыцця на вакзале, у іх з'яўляецца магчымасць пазнаёміцца з усёю прыгажосцю Беларусі. Наяўнасць тэматычных маршрутаў значна лепш прадэманструе гісторыю і культуру, чым стэрэатыпнае наведванне музеяў. Каб прыцягнуць замежных грамадзян, зацікавіць іх застацца на пару дзён менавіта ў нашай краіне, па словах распрацоўшчыкаў праграмы «Belarus N», патрэбен новы падыход да стварэння турыстычнай інфраструктуры.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Факт

# ПТУШЫНАЕ МАЛАКО

## У першым паўгоддзі выраб малака павялічыўся на 6,2%, а рэалізацыя жывёлы і птушкі — на 4,1%

**Сёлета за шэсць месяцаў у гаспадарках усіх катэгорый (у тым ліку фермерскіх і падсобных) вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў бягучых цэнах склала 42,1 трл рублёў і павялічылася ў параўнанні з І паўгоддзем 2014 года ў супастаўных цэнах на 2,7%, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. А ў сельскагаспадарчых арганізацыях аб'ём вытворчасці прадукцыі за гэты перыяд павялічыўся на 3,6%.**

Спецыялісты адзначаюць, што за гэты час гаспадаркамі ўсіх катэгорый краіны рэалізавана жывёлы і птушкі на забой (у жывой вазе) 814,2 тысячы тон, што на 4,1% больш, чым за адпаведны перыяд летась, выраблена малака — 3 млн 518 тысяч тон (на 6,2% больш), атрымана яек — 1 трл 920,8 млн штук (на 0,9% больш). Эксперты Белстата паведамляюць, што па стане на пачатак ліпеня сёлета колькасць буйной рагатай жывёлы ў сельскагаспадарчых арганізацыях склала 4,3 млн галоў і ў параўнанні з адпаведнай датай папярэдняга года павялічылася на 1,4%, у тым ліку кароў — 1,4 млн галоў (на 0,5% больш). Пагалоўе свіней за першае паўгоддзе павялічылася на 0,8% і склала 2,7 млн галоў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ**
**10 сентября 2015 г. торгов**
**по продаже конфискованного имущества**

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества | Помещение транспортного назначения инв. номер 500/D-70776409, гараж № 17 площадью 42,2 м², расположенный по адресу: г. Минск, ул. Слободская, 72-17 |
| Начальная цена | 217 120 000 рублей |
| Сумма задатка | 21 710 000 рублей |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г.Минск, код 153001369; получатель — УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 10 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 03.08.2015 по 04.09.2015 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

■ Віншуем!

# ДАКРАНАННЕ ЛЮБОЎЮ

## Тэатр як жыццё для крытыка, прафесара, доктара філалагічных навук Таццяны АРЛОВАЙ

**Беларускі тэатр быў, беларускі тэатр ёсць. Каб «быў» і «ёсць» звязваліся ў адну сістэму, у адзін працэс, існуюць людзі, якія вывучаюць тэатр, аналізуюць яго стан і з'явы, тлумачаць, што ёсць «дрэнна» і «добра», дзе ёсць думка і якая, тым самым выхоўваючы чалавека. Гэтым усё сваё жыццё займаецца адна з самых аўтарытэтных тэатральных крытыкаў Беларусі Таццяна Дзмітрыеўна Арлова, якая 28 ліпеня адзначае 80-гадовы юбілей. Для шмат каго са звяздоўцаў — настаўніца, для нашых чытачоў — аўтарка, у свой час вядучая рубрыкі «Тэатральнае паляванне».**

У дачыненні да яе выраз «усё жыццё ў тэатры і з тэатрам» абсалютна справядлівы. Яе бацька — савецкі акцёр, рэжысёр і выкладчык Дзмітрый Арлоў, народны артыст БССР. Таццяна Дзмітрыеўна прысвяціла яму адну са сваіх кніжак, якая так і называецца: «Настаўнік Д.А. Арлоў». Настаўнікамі для яе былі ўсе творчыя людзі, якіх яна бачыла з дзяцінства, настаўнікам быў і сам тэатр, дзе вызначыўся яе асабісты творчы лёс: пісаць пра тэатр, ведаць яго, разумець. І вучыць гэтаму іншых.

Яна працягвае гэта рабіць: Таццяна Арлова — прафесар кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ. Фактычна сама з яго выйшла, працавала па спецыяльнасці журналісткай, пісала ў тым ліку пра тэатр. Далей была аспірантура ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР і вяртанне на журфак БДУ у якасці выкладчыцы, дзе Таццяна Арлова працуе з 1972 года і да гэтага часу. Яна ўводзіла ў журналістыку, працягвае зацягваць у гісторыю мастацтваў, адкрывае свет культуры, калі распавядае пра дасягненні старажытных цывілізацый свету. Але найбольш любімыя яе прадметы ў будучых журналістаў тыя, што звязаны з тэатрам. Таму што адзін з галоўных яе клопатаў у жыцці — падрыхтоўка тэатральных крытыкаў. Яна разумее: патрэбны такія людзі, якія даследуюць працэс, назіраюць за тэатрам нібыта збоку, але насамрэч паглыбленыя ў асаблівасці яго існавання, таму могуць выказваць сваю думку з адзінай мэтай: дапамагаць тэатру быць лепшым, больш дасканалым, дзе ўсе часткі сплятаюцца і суіснуюць у гармоніі дзеля гледача. Тым самым гэтыя людзі — крытыкі — дапамагаюць тэатру не спыняцца, а развівацца, ісці далей, бо гэтае мастацтва па-свойму адлюстроўвае час і размаўляе з людзьмі. Сама Таццяна Дзмітрыеўна з'яўляецца прыкладам у гэтым, прынамсі, яна член Міжнароднай асацыяцыі тэатральных крытыкаў UNESCO. Здабыла сабе імя вельмі неабыякавага і прынцыповага крытыка, які карыстаецца павагай не толькі тых, хто піша, але і тых, хто стварае тэатр, а гэта дарагога вартае.

Гэта вартае безлічы прагледжаных спектакляў. Вартае велізарнай колькасці напісаных рэцэнзій (якія працягваюць з'яўляцца ў рэспубліканскім друку). Вартае доктарскай дысертацыі на тэму «Тэатральная журналістыка. Узнікненне. Станаўленне, функцыянаванне ў СМІ». І яшчэ больш за 150 навуковых публікацый, амаль двух дзясяткаў кніг, сярод якіх асобныя прысвечаныя выдатным беларускім акцёрам Расціславу Янкоўскаму, Бэле Масумян. У 2007 годзе Арлова стала лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Кандрата Крапівы. А ў 2012 годзе ўзнагароджана прэміяй імя Пічэты (у гонар першага рэктара БДУ). Па падручніках Арловай вучацца журналісты, але па тых, што прысвечаны тэатру, могуць лепш разумець і любіць гэтае мастацтва і звычайныя гледачы.

Яна вучыць любіць — гэта вызначальнае ў ёй як у выкладчыку, як у крытыку і чалавеку. Таму што жыццё можа скласціся па-рознаму — у журналістаў, крытыкаў ці тых, хто будзе для тэатра простым гледачом. Але ёсць момант дакранання, нават лёгкага дотыку, аднаго слова ці кароткай рэмаркі, якіх бывае дастаткова для таго, каб зразумець, у чым сутнасць чалавечай культуры наогул, якая фарміравалася тысячагоддзямі, пакідала лепшае, ішла наперад. І ўсё таму, што ствараласа з любоўю да чалавека. І не пакідала надзеі зрабіць яго лепшым, прапаноўваючы думкі для асэнсавання сваёй наканаванасці, неабходнасці, значнасці. І тады зразумела, чаму яна вечная. Відавочна, як можа быць вечным чалавек, які лічыць сябе гаспадаром у свеце.

Культуру ствараюць людзі. Нават адзін чалавек можа яе ствараць, калі ўмее паказаць кірунак іншым. Адзін настаўнік, які можа даць адчуванне любові да справы.

Вучні Таццяны Дзмітрыеўны са «Звязды» і аматары тэатра далучаюцца сёння да віншаванняў.


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ СРОКОМ НА 3 ГОДА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ГОСУДАРСТВЕННОМУ ПРЕДПРИЯТИЮ «КОМПЛЕКС ПО ОКАЗАНИЮ УСЛУГ ИМЕНИ П.М.МАШЕРОВА» НА ПРАВЕ ХОЗЯЙСТВЕННОГО ВЕДЕНИЯ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | Право заключения договора аренды административного помещения с инв. №500/D-708125575. Площадь – 32,2 кв.м. Этаж – 5-й. Адрес: г. Минск, пр-т Победителей 23/ 3-5. | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | **Шаг аукциона, %** |
| | | 966 000 | 96 600 | 5 796 000 | 5 |
| **Лот №2** | Право заключения договора аренды части (149,0 кв.м) изолированного помещения с инв. №500/D-7114337 - складские помещения в подвале магазина. Адрес: г. Минск, ул. Олега Кошевого, д. 8-2Н. | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | **Шаг аукциона, %** |
| | | 4 470 000 | 447 000 | 10 549 200 | 5 |
| **Лот №3** | Право заключения договора аренды части (762,6 кв.м) административного помещения с инв. №500/D-708009850. Этаж – 4-й. Адрес: г. Минск, ул. Филимонова, д. 25-10. | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | **Шаг аукциона, %** |
| | | 22 878 000 | 2 287 800 | 73 209 600 | 5 |
| **Лот №4** | Право заключения договора аренды части (834,3 кв.м) административного помещения с инв. №500/D-708009851. Этаж – 5-й. Адрес: г. Минск, ул. Филимонова, д. 25-11. | **Начальная цена продажи права с НДС, руб.** | **Задаток с НДС, руб.** | **Сумма арендной платы в месяц с НДС, руб.** | **Шаг аукциона, %** |
| | | 25 029 000 | 2 502 900 | 80 092 800 | 5 |

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина с 01.04.2015 равна 120 000 бел. руб.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 и (или) Лот №2 и (или) Лот №3 и (или) Лот №4 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) — Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота №1 и (или) Лота №2 и (или) Лота №3 и (или) Лот №4 в течение в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере:
— 6 000 000 (Шесть миллионов) белорусских рублей при продаже Лота №1, Лота №2; — 10 000 000 (Десять миллионов) белорусских рублей при продаже Лота №3, Лота №4 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.
Цена продажи права заключения договора аренды Объекта — единовременный платеж, который не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение) и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 10 000 000 рублей.

**Аукцион состоится 28.08.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению. Подача документов по почте не допускается.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества (Лот №__), принадлежащего государственному предприятию «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова», проводимом 28 августа 2015 г.

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости лота (лотов). Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 26.08.2015 в 12.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): 8 (017) 306-47-35 Игорь Михайлович, 8 (017) 8 (017) 306-44-98 Валерий Алексеевич.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



## Извещение о проведении 28 августа 2015 года торгов по продаже имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения ИЧУПП «Белстройтрансгаз»

| **Предмет торгов** |
|---|
| «Производственное помещение» с инвентарным номером 500/D-708058517 общей площадью 559,7 кв. м (назначение: производственное помещение; местонахождение: г. Минск, ул. Старовиленская, 129-5); «Складское помещение» с инвентарным номером 500/D-708149904 общей площадью 20,7 кв. м (назначение: складское помещение; местонахождение: г. Минск, ул. Старовиленская, 129-4); «Помещение пяти гаражных боксов в здании мастерской» с инвентарным номером 500/D-718424 общей площадью 143 кв. м (назначение: помещение неустановленного назначения; местонахождение: г. Минск, ул. Старовиленская, 131/3-2); «Магазин. Литер Ж 1/К» с инвентарным номером 500/С-30634 общей площадью 95 кв. м (назначение: здание специализированное розничной торговли; местонахождение: г. Минск, ул. Старовиленская, 127); «Склад сырья. Транспортный участок. Литер З 1/к» с инвентарным номером 500/С-21829 общей площадью 257 кв. м (назначение: здание специализированное иного назначения; местонахождение: г. Минск, ул. Старовиленская, 125) |
| Начальная цена – 10 387 589 473 белорусских рубля с учетом НДС |
| Сумма задатка – 1 038 758 947 белорусских рублей |
| Сумма шага аукциона – 520 000 000 белорусских рублей |

Продавец имущества – иностранное частное унитарное производственное предприятие «Белстройтрансгаз» открытого акционерного общества «Стройтрансгаз», ул. В. Хоружей, д. 22, 220123, г.Минск.

Организатор торгов — УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К.Маркса, 39, к.10, 220030, г.Минск.

Торги проводятся в порядке, установленном Законом Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление на участие в торгах (по форме, установленной организатором торгов) с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа о внесении задатка;
- копии свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей);
- легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в торгах) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности (для организаций – нерезидентов Республики Беларусь).

Физические лица, индивидуальные предприниматели предъявляют организатору торгов документ, удостоверяющий личность; представители физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляют организатору торгов оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. Протокол о результатах торгов подписывается победителем торгов (претендентом на покупку) в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (претенденту на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) подписывается в течение 10 дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 30 дней со дня проведения торгов.

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются победителем торгов (претендентом на покупку) на расчетный счет организатора торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **28 августа 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.07.2015 по 24.08.2015 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017) 287-37-29, (029) 355-14-10 .

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)287-37-29, (029)355-14-10 (ИЧУПП «Белстройтрансгаз» в лице управляющего ООО «Антикризисное управление»).**



**ПЕРЕГОВОРЫ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

**УП «Проектный институт Белгипрозем» приглашает вас принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для разработки проекта электроснабжения.**

Предмет закупки — разработка проекта электроснабжения кабинетов 2 этажа здания с заменой этажного щитка. Согласование проекта в филиале «Энергонадзор» РУП «Мискэнерго», ГУ «Главное хозяйственное управление» Управления делами Президента Республики Беларусь, РУП «БелЭЗ». Получение специального разрешения на нагрев для работы муфельной печи и водонагревателя.

Срок выполнения работ — август 2015 г.

Время проведения переговоров — 4 августа 2015 года в 11.00.

**Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: 207-05-33, тел./факс 212-07-00.** УНП 100035563



Утерянные страховые полисы по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 0654359, 0765292, 0710199, 0710202, 0710205, страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств — членов системы «Зеленая карта» серии BY/07/07483205, BY/07/11539171 страховой компании «Промтрансинвест» считать недействительными. УНП 100357923

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №2

# ГЛЕБА ДЛЯ ДЗЕЯННЯЎ

## Дэградацыя зямель прызнана адной з пагроз нацыянальнай бяспекі

**Спецыялісты б'юць трывогу: такой засухі, якую давялося назіраць гэтай вясной і летам, у Беларусі не было больш за дзесяць гадоў. Яны прагназуюць падзенне ўраджайнасці азімых збожжавых у асобных раёнах на 40-45% у параўнанні з леташнімі паказчыкамі. Даўся ў знакі нізкі запас вільгаці ў глебе. Што гэта: чарговыя капрызы прыроды або вынік няправільнага ўздзеяння на глебы? І наогул, ці не ператворыцца Сінявокая аднойчы ў змярцвелую пустыню?**

### НЕ ЧАРНАЗЁМ, АЛЕ ЎСЁ МАГЧЫМА

Эксперты Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя супакойваюць: нашай краіне апустыньванне пакуль не пагражае, дзякуючы дастатковай колькасці ападкаў і наяўнасці пастаяннай раслінасці (лясы і лугі). Між тым у Беларусі выяўлена больш за 20 відаў і формаў дэградацыі зямель (улічваючы глебы). Страты ўраджаю на нездаровых землях складаюць ад 5 да 60%. У цэлым па краіне 29 раёнаў знаходзяцца ў групе з неспрыяльным экалагічным станам зямель, а 62 раёны прызнаны непрыдатнымі для вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Па словах **загадчыка навукова-даследчай лабараторыі экалогіі ландшафтаў БДУ Валянціна ЯЦУХНА**, у Беларусі налічваецца 443 разнавіднасці глебы. Самы распаўсюджаны тып — дзярнова-падзолістыя глебы — не могуць пахваліцца высокай урадлівасцю. Па гэтым крытэрыі нашы глебы істотна адрозніваюцца. Напрыклад, у Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці сярэдні кадастравы бал урадлівасці глеб складае ўсяго 17, у Нясвіжскім Мінскай вобласці — 40 (з 100 магчымых). Сярэдні паказчык для Беларусі — 32 балы, даволі невысокі, калі параўноўваць з паказчыкамі краін-суседзяў.

Ёсць і рэдкія для краіны дзярнова-карбанатныя глебы (Жыткавіцкі, Столінскі раёны) з высокай урадлівасцю. Іх ацэньваюць максімальнымі 100 баламі, аднак такой зямлі мала. Для нас гэтыя «чарназёмы», можна сказаць, унікальныя.

Але, нават нягледзячы на слабую прыродную ўрадлівасць глеб, Беларусь уваходзіць у лік дваццаці першых краін свету па велічыні долі ворных зямель на аднаго чалавека, якая складае 0,6 га.

### НА ШТО «ХВАРЭЕ» НАША ЗЯМЛЯ?

— Водная і ветравая эрозія — асноўныя віды дэградацыі глеб Беларусі, — інфармуе **намеснік дырэктара па навуковай рабоце рэспубліканскага навуковага дачынага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі», кандыдат сельскагаспадарчых навук Андрэй ЧАРНЫШ.** — Ужо дэградавалі 550 тысяч га, а глебы з патэнцыйна магчымай праявай эрозіі (эразійнанебяспечныя) займаюць каля 40% ад усіх сельскагаспадарчых зямель. 1,4 мільёна га — патэнцыйна небяспечныя ў дачыненні да воднай эрозіі, 1 мільён га — да ветравой.

Пры ветравой эрозіі здзімаюцца ўрадлівыя пласты глебы. Звычайна «захворванне» праяўляецца вясной, калі глеба перасохла, а расліны яшчэ не з'явіліся, і ўвосень, пасля збору ўраджаю. Характэрная праява — пяскуваныя буры. Водная эрозія ўзнікае з-за моцных ападкаў, а за апошнія гады ліўні сталі звычайнай з'явай.

Па звестках Інстытута глебазнаўства і аграхіміі, штогод губляецца каля 10-15 тон з га глебавага драбназёму, азоту — 10 кг з га, фосфару і калію — 4,5 кг з га, кальцыю і магнію — па 56 кг з га, а перагною —150 кг з га. Куды «знікаюць» усе гэтыя рэчывы? Ва ўмовах складанага рэльефу яны змываюцца вадой і трапляюць у вадаёмы, у выніку адбываецца лакальная экалагічная катастрофа — забруджванне вады.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

© Worldpress.com

Як абараніць глебу ад воднай эрозіі? Універсальнага рэцэпту няма. Вядома, што вырошчванне шматгадовых культур дазваляе абараніць глебу на 90%, збожжавых — на 50-60%. Таксама спецыялісты не рэкамендуюць пакідаць глебу адкрытай, пустой. Калі глебы непрыдатныя для сельскай гаспадаркі, варта пазбягаць гэтай дзейнасці і пакінуць іх у натуральным стане.

Андрэй Чарныш вылучае і такую форму дэградацыі, як ушчыльненне глебы. Яно адбываецца ў асноўным праз выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі, якая разбурае структуру глебы. Прыкладна палова ўсіх беларускіх ворных зямель ушчыльнена, і гэта непазбежны працэс. Спецыялісты бачаць выйсце ў выкарыстанні такіх прыёмаў апрацоўкі глебы, як шчыляванне і рыхленне.

На думку навукоўца, дзяржава выдаткоўвае дастаткова сродкаў для пераадолення дэградацыі глеб. Трэба толькі памятаць: эрадзіраваныя і эразійнанебяспечныя землі патрабуюць дыферэнцаванага падыходу. У барацьбе з эрозіяй на першае месца спецыяліст ставіць правільную арганізацыю тэрыторыі — мэтазгоднае выкарыстанне зямель з улікам ландшафтных асаблівасцяў. Затым варта правільна падабраць культуры — гэта самы просты і танны спосаб, пры якім дадаткова не трэба араць зямлю альбо праводзіць шчыляванне. Можна замяніць узворванне безадвальнай апрацоўкай альбо глыбокім рыхленнем: гэтыя прыёмы абараняюць глебу. Ёсць сэнс і ў правядзенні аграхімічных мерапрыемстваў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

■ Далучайцеся!

# ПАСЕЕШ ІНІЦЫЯТЫВУ — ПАЖНЕШ ПРАЕКТ

## Абвешчаны конкурс на найлепшае ажыццяўленне ідэй «зялёнай» эканомікі

**Падчас Энергетычнага тура, які адбыўся 16 ліпеня ў горадзе Жыткавічы, прайшлі адукацыйныя семінары па прынцыпах і падыходах зялёнай эканомікі. Пасля тэарэтычнай часткі ахвотныя змаглі пазнаёміцца з сучаснымі энергаэфектыўнымі тэхналогіямі, прадстаўленымі супрацоўнікамі ўстановы «Цэнтр экалагічных рашэнняў». Як вядома, энергаэфектыўнасць — адзін з прыярытэтных напрамкаў развіцця зялёнай эканомікі ў нашай краіне.**

Галоўнай тэмай мерапрыемства стала прэзентацыя конкурсу «зялёных» ініцыятыў, анансаванага ў рамках праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі», што фінансуецца Еўрасаюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. Яго мэта — паказаць, як зялёная эканоміка працуе на рэальных прыкладах. Бюджэт конкурсу складае звыш 1 мільёна 600 тысяч еўра, на кожны праект выдзяляецца 110 тысяч еўра. Такім чынам, арганізатары прафінансуюць каля 15 ініцыятыў.

Трэба адзначыць, што Жыткавіцкі раён выбраны пілотнай тэрыторыяй праекта па «зялёнай» эканоміцы. Адно з найбуйнейшых беларускіх азёр — Чырвонае — з'яўляецца крыніцай сапрапеляў, з якіх атрымліваюць высокаэфектыўныя арганічныя ўгнаенні. У рамках праекта мяркуецца набыць абсталяванне для здабычы і перапрацоўкі гэтага рэчыва.

— Залежы сапрапеляў на возеры складаюць 69 мільёнаў тон, з 1978 года мы здабылі 1 мільён 200 тысяч тон, — распавёў **дырэктар прадпрыемства «Жыткавічыхімсэрвіс» Віктар АТЛІВАНАЎ.** — Прывяду лічбы: каб забяспечыць мінеральнымі ўгнаеннямі гектар зямлі, мы выдаткоўваем каля 2 мільёнаў рублёў. Угнаенне можна замяніць 10 тонамі сапрапеляў, максімальны кошт якога — 40 тысяч рублёў за тону. Эканомія відавочная.



На фестывалі энергазберажэння жыткавічанам прапанавалі пракаціцца на электравеласіпедзе.

**Кіраўнік праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» Вольга ЧАБРОЎСКАЯ** больш дэталёва прадставіла ўмовы конкурсу «зялёных» ініцыятыў.

— Мы будзем аддаваць перавагу праектам з рэгіёнаў, — падкрэсліла суразмоўца.

**Заяўкі прымаюцца толькі ад афіцыйна зарэгістраваных недзяржаўных арганізацый. Арганізатары чакаюць праекты па абыходжанні з адходамі, экалагічным турызме, захаванні біяразнастайнасці і ўстойлівага выкарыстання біярэсурсаў і земляў, аднаўляльных крыніц энергіі і энергаэфектыўнасці, устойлівым кіраванні воднымі рэсурсамі і водна-балотнымі ўгоддзямі, экаінавацыях, экамаркіроўцы, арганічнай сельскай гаспадарцы, экасістэмных паслугах. Умоўна кажучы, такія мерапрыемствы, як закупліванне кантэйнераў для наладжвання сістэмы збору адходаў ці замена асвятлення ў горадзе падыходзяць пад названыя крытэрыі. Праект мусіць быць завершаны да канца 2016 года, на яго выкананне адводзіцца 18 месяцаў. Прапановы будуць прымацца да 31 жніўня 2015 года, форму заяўкі можна знайсці на сайце greenlogic.by**

— Наш раён зацікаўлены ў рэалізацыі розных праектаў, у нас назапашаны вопыт у гэтай галіне. У 2012 годзе мы ўдзельнічалі ў праекце па рэалізацыі тэрытарыяльна арыентаванага развіцця рэгіёнаў. З апошніх экалагічных ініцыятыў — захаванне вадасховішчаў у пойме ракі Прыпяць, — адзначыў **намеснік старшыні Жыткавіцкага райвыканкама Валерый РАГАЛЕВІЧ.** — Але варта быць крытычнымі: у параўнанні са сталіцай і вопытам іншых краін, мы толькі пачынаем рэалізоўваць праекты, нам трэба яшчэ шмат развівацца ў гэтым кірунку.

Пасля семінараў жыткавічане прынялі ўдзел у фестывалі энергазберажэння і «зялёнай» эканомікі. Удзельнікі мерапрыемства наведалі выстаўку «Вандроўка на самую вялікую энергастанцыю Беларусі», змаглі падлічыць энергаэфектыўнасць кватэры, пракаціцца на электравеласіпедзе, паўдзельнічаць у конкурсе малюнкаў «Я зберагаю энергію», размаляваць экасумку.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*
*Мінск — Жыткавічы — Мінск.*

# ГЛЕБА ДЛЯ ДЗЕЯННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Хімічнае забруджванне глебы — яшчэ адно праяўленне дэградацыі глеб. Пераважаюць такія шкодныя для глебы рэчывы, як свінец, кадмій, нікель, медзь, ртуць і нафтапрадукты. Зараз вядзецца актыўная праца па пераадоленні радыеактыўнага забруджвання: удасканальваюцца тэхналогіі, якія перашкаджаюць паступленню радыенуклідаў у расліны.

## ТАРФЯНІКІ — БУДУЧЫЯ ПУСТЫНІ?

«Ранамі зямлі» называюць выпрацаваныя ў выніку меліярацыі тарфянікі. У свой час Беларусь была піянерам сярод краін СССР у гэтай сферы. Яшчэ зусім нядаўна тэрыторыя нашай краіны адносілася да зоны залішняга ўвільгатнення: кожны сёмы гектар быў балотам. Глебы асушаных балот, здавалася, падораць харчовы дабрабыт на доўгія гады. У выніку меліярацыі (якая, дарэчы, перакладаецца з лацінскага як «паляпшэнне») у нас засталося больш за 200 тысяч га выпрацаваных тарфянікаў.

Што адбываецца з імі сёння? «Гэтыя землі альбо зусім не выкарыстоўваюцца, альбо выкарыстоўваюцца вельмі незадавальняюча», — тлумачыць **навуковы супрацоўнік Інстытута меліярацыі і лугаводства НАН Беларусі Анатоль МЕЯРОЎСКІ.** Вярнуць да жыцця дэградаваныя землі можна пры дапамозе паўторнага забалочвання. На плошчы каля 50 тысяч га гэтая працэдура ўжо праведзена.

Мерапрыемствы па паўторным забалочванні падтрымліваюцца міжнароднымі арганізацыямі. Напрыклад, з 2013 года рэалізуецца праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі ПРААН / ГЭФ «Распрацоўка інтэграваных падыходаў да кіравання водна-балотнымі ўгоддзямі з улікам прынцыпу шматмэтавага ландшафтнага планавання з мэтай атрымання шматбаковых экалагічных выгод» («Тарфянікі-2»). Ён садзейнічае аднаўленню тарфянікаў, якія раней выкарыстоўваліся ў лясной і сельскай гаспадарках. Праект «КлімаІст»: захаванне і ўстойлівае кіраванне тарфянікамі ў Беларусі для скарачэння выкідаў вуглякіслага газу і адаптацыі балотных экасістэм да зменаў клімату» пачаўся ў лютым 2014 года, разлічаны на чатыры гады. Яго мэта — аднаўленне нізінных балот «Званец» і «Спораўскае», асноўных месцаў гнездавання на тэрыторыі Беларусі вяртлявай чаротаўкі — рэдкай птушкі, занесенай у Чырвоную кнігу краіны.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Што трэба зрабіць, каб выпрацаваныя тарфянікі не ператварыліся ў пустыні і не ўчынілі катастрофу для сельскай гаспадаркі і эканомікі краіны? — задаецца пытаннем **каардынатар праекта «Тарфянікі-2» Аляксей АРЦЮШЭЎСКІ.** — Мы прапануем трансфармаваць тарфяныя землі, якія раней выкарыстоўваліся, у шматгадовыя лугавыя ўгоддзі. З аднаго боку, гэта дазволіць рэзка запаволіць хуткасць мінералізацыі арганічнага рэчыва і дэградацыі тарфяных зямель. З іншага боку, дасць магчымасць ажыццяўляць эканамічную дзейнасць на экалагічна дружалюбнай аснове.

### Пыльныя буры

**Гэтай вясной інтэрнэт ускалыхнуў відэаролік, галоўным «героем» якога стала апакаліптычная пыльная бура, што накрыла Салігорск. За апошнія 45 гадоў у Беларусі зафіксавана 350 такіх выпадкаў. Мабыць, гэта самая пераканаўчая праява ветравой эрозіі і разам з тым яскравы паказчык кліматычных змен.**

## НОВАЯ СТРАТЭГІЯ

Сёння дэградацыя зямель прызнана адной з пагроз нацыянальнай бяспекі краіны. 2015 год быў абвешчаны Сусветным годам глеб, а ў красавіку Мінпрыроды Беларусі зацвердзіла Стратэгію па рэалізацыі гэтага дакумента і Нацыянальны план па прадухіленні дэградацыі зямель (улічваючы глебы) на 2016-2020 гады. Дакументы ўзаемазвязаны: калі ў стратэгіі пазначаны асноўныя праблемы і напрамкі, то ў плане прапісаны канкрэтныя мерапрыемствы, якія будуць рэалізаваны ў Беларусі.

Сярод прыярытэтаў вылучаюць захаванне агратэхналогій, якія забяспечваюць захаванне натуральнай урадлівасці глеб, распрацоўку інавацыйных тэхналогій, развіццё навуковага патэнцыялу ў галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання зямель. Акрамя гэтага, плануецца звесці да мінімуму ўзровень мінералізацыі арганічнага рэчыва тарфяных глеб і аднавіць парушаныя экасістэмы. У спісе значыцца развіццё арганічнага земляробства.

Дэградацыя глеб прызнана пагрозай глабальнага маштабу. З гэтым сцвярджэннем згодны і ў Беларусі, бо калі не звярнуць увагу на «хваробы» глеб ужо цяпер, якая будучыня чакае нас праз дзясяткі гадоў?

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

■ Экалагічны лікбез

# ПАКІНЬ ЖАЛЕЗНАГА КАНЯ Ў «СТАЙНІ»

**З надыходам цёплага лета гараджане накіраваліся да вадаёмаў: пікнікі, рыбалка, купанне... Усё гэта добра, калі паводзіць сябе ля воднай роўнядзі акуратна. Аднак практыка паказвае, што, адпачываючы, беларусы і госці нашай краіны часта наносяць шкоду прыродзе: свядома або міжволі. Гэта паказалі рэйдавыя праверкі Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя сумесна з органамі Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства лясной гаспадаркі, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а таксама дзяржаўнымі прыродаахоўнымі ўстановамі.**

Здавалася б, што можа быць прасцей: прыехаў на адпачынак на аўтамабілі, паставіў яго на паркоўку і прайшоў пешшу, любуючыся беларускімі краявідамі. Не, любіць у нас некаторыя кіроўцы з ветрыкам ды з гучнай музыкай пад'ехаць на беражок. Па звестках Мінпрыроды, стаянка транспартных сродкаў у межах прыбярэжных палос водных аб'ектаў на адлегласці да 30 м ад зрэзу вады — найбольш распаўсюджанае парушэнне Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Так «адпачываў» на вадасховішчы Дразды мінчанін 1989 нараджэння: яго «Сітраен» стаяў за 20 метраў ад зрэзу вады, калі з праверкай прыйшлі работнікі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Грамадзянін быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з часткай 2 артыкула 15.51 Асаблівай часткі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях у выглядзе штрафу на суму 90000 беларускіх рублёў.

Закон — адзін для ўсіх, у тым ліку для замежных грамадзян. 3 мая 2015 года на Цнянскім вадасховішчы правяральнымі органамі была аштрафавана на 90 000 рублёў грамадзянка Кітая 1992 нараджэння, якая жыве ў горадзе Харбін. Яе аўтамабіль маркі «Мэрсэдэс-Бенц» таксама быў прыпаркаваны на адлегласці да 30 м ад зрэзу вады.

### Даведка:

**У адпаведнасці з Водным кодэксам стаянка механічных транспартных сродкаў да 30 метраў па гарызанталі ад берагавой лініі не дапускаецца.**

**Згодна з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, парушэнне рэжыму ўтрымання водаахоўных зон і прыбярэжных палос водных аб'ектаў або водаахоўнага рэжыму на вадазборах, іх забруджванне цягнуць накладанне штрафу на фізічную асобу ў памеры да дзесяці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — да трыццаці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — да пяцідзесяці.**

Зразумела, з гэтымі грамадзянамі былі праведзены прафілактычныя гутаркі аб недапушчэнні здзяйснення парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства, парушальнікі прызналі сваю віну, таму да іх былі ўжытыя самыя ніжнія межы штрафаў.

# НАВОШТА ПАЛІЦЬ ТРАВУ?

Колькі ні гавораць спецыялісты Мінпрыроды пра тое, што спальваць сухую расліннасць і смецце катэгарычна забараняецца, усё роўна з прыходам вясны адзначаецца ўсплёск падобных правапарушэнняў. Вясновае і восеньскае падпальванне сухой травы пры вядзенні гаспадаркі стала традыцыяй, стэрэатыпам прыродакарыстання і паводзін. Як вынік — шкода здароўю жыхароў, глебе і... штраф у памеры 1 800 000 рублёў. Менавіта на такую суму быў аштрафаваны прадстаўнік Смаргонскага ПМС у адпаведнасці з артыкулам 15.57 асаблівай часткі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях. Работнікі прадпрыемства вырашылі прыбраць старую сухую траву, не мудруючы, — проста падпаліць.

### Даведка:

**У адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях, незаконнае выпальванне сухой расліннасці, траў на корані, а таксама ржышча і пажніўных рэшткаў на палях або непрыняцце мер па ліквідацыі выпальванняў на зямельных участках цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да сарака базавых велічынь.**

Згадзіцеся, сумы гэтыя несувымерна малыя ў параўнанні з той шкодай, якая наносіцца прыродзе. У СМІ неаднаразова ўздымалася пытанне аб тым, што дзейныя нормы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Беларусі, якія прадугледжваюць прыцягненне вінаватых асоб да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства, з'яўляюцца недастатковымі. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь прапанавала Палаце прадстаўнікоў унесці ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях норму аб павышэнні ніжняй планкі штрафных санкцый за прыродаахоўныя парушэнні. Праектам закона прадугледжваецца ўзмацніць адміністрацыйную адказнасць па артыкуле 15.30 КоАП «Забруджванне лясоў і іншай дрэўна-хмызняковай расліннасці» як у дачыненні да грамадзян, так і да індывідуальных прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб, да максімальна дапушчальных (на фізічную асобу штраф складзе ад дзесяці да пяцідзесяці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад пяцідзесяці да двухсот базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад двухсот да васьмісот базавых велічынь).

Акрамя таго, прапануецца павялічыць штрафныя санкцыі за парушэнні правілаў карыстання транспартнымі сродкамі, якія вядуць да забруджвання вод, аж да канфіскацыі аўтамабіля за паўторнасць такога правапарушэння, здзейсненага на працягу года.

**Аляксандр ЦАБРУК, намеснік начальніка ўпраўлення Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.**

■ У свеце раслін

# «БРОВЫ» ПАДМАНШЧЫЦЫ

## Якая кветка выдае сябе за асу?

Са старажатнагрэчаскай мовы слова «офрыс» — імя аднаго з родаў сямейства архідных — абазначае «бровы». Такое метафарычнае імя расліне даў Пліній, але спецыялісты не змаглі адгадаць, каму было прызначана параўнанне і вырашылі пакінуць яго архідэям. Прадстаўнікі роду «офрыс» унікальныя па разнастайнасці формаў і колераў сваіх кветак. У Беларусі расце офрыс насякоманосная, альбо муханосная (лацінская назва — Ophrys incectifera). Як і ва ўсіх прадстаўнікоў роду, у гэтай кветкі адсутнічае пылок і нектар. Дзякуючы неардынарнай знешнасці і спецыфічным ферамонам яна прываблівае да сябе насякомых-апыляльнікаў. Самцы пясочнай асы (Argogorytes mystaceus) прымаюць кветкі за самак і, закрануўшы пыльнікі, апыляюць расліну. Цікава, што кожны від расліны-падманшчыцы мае канкрэтнага апыляльніка — асу, авадня альбо пчалу ці павука...

Мініяцюрная архідэя дасягае ад 20 да 40 сантыметраў у вышыню. Суквецці ў яе колападобныя, самі кветкі нагадваюць насякомае, пялёсткі венчыка маюць чырвона-бурую афарбоўку. Зімою травяністая частка расліны адмірае, а ў глебе застаюцца толькі клубні, у якіх захоўваецца запас пажыўных рэчываў. Цвіце офрыс у чэрвені-ліпені.

Упершыню на тэрыторыі Беларусі «бровы» былі заўважаны ў 2009 годзе. Загадчык кафедры батанікі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Алег Созінаў знайшоў дзве невялікія папуляцыі па 15-20 раслін на балоце Чысцік, што на тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка. А сёлета падчас экспедыцыі навуковыя супрацоўнікі Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — Вольга Казлова, Марына Бядуленка і Алеся Кручонак — выпадкова выявілі другі пункт прапіскі рэдкай расліны. Ёй аказалася забалочаная лугавіна ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. На гэтым месцы батанікі налічылі каля 250 квітнеючых архідэй.

Офрыс насякоманосная расце на поўдні Карэліі, у Прыбалтыцы, Карпатах, Скандынавіі, Сярэдняй і Атлантычнай Еўропе, Міжземнамор'і. Селіцца на лугах, каля кустоўя, расце і на забалочаных мясцінах. Галоўная умова паспяховага развіцця расліны — наяўнасць кальцыю ў глебе ці ў вадзе, якая сілкуе глебу.

Для наступных эксперыментаў навукоўцы прывезлі насенне офрыс у Цэнтральны батанічны сад. Вольга Казлова працуе над вывучэннем асаблівасцяў увядзення кветкі ў культуру in vitro (размнажэнне раслін «у прабірцы») для стварэння рэзервовай папуляцыі на выпадак знікнення прыроднай.

Лугавая архідэя трапіла і ў спіс чырванакніжнікаў — яна мае статус аховы I катэгорыі. Мясціны, на якіх

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Самцы ос не адрозніваюць офрыс ад сваіх самак.**

заўважаюць офрыс, трапляюць пад апеку дзяржавы. Іншых сваякоў роду офрыс, які налічвае каля 35 відаў, у Беларусі пакуль не знайшлі. Затое ёсць падставы меркаваць, што насякоманосная архідэя прыжылася і ў іншых частках Беларусі — толькі варта добра пашукаць.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

■ Усё, што вы хацелі спытаць пра...

# ЯКАСЦЬ І ПАТЭНЦЫЯЛ ПІТНОЙ ВАДЫ

**Дэфіцыт чыстай пітной вады — праблема, актуальная для многіх краін свету. Змена клімату, нерацыянальнае выкарыстанне прыродных багацяў і іншыя дзеянні чалавека ўсё часцей прыводзяць да змяншэння запасаў гэтага стратэгічна важнага рэсурсу.**

**Ці існуе такая пагроза ў нас? Якія праблемы сёння найбольш актуальныя для нашай краіны ў плане даступнасці і якасці крыніц чыстай пітной вады?**

**Па інфармацыі Мінпрыроды, зараз у Мінску рэалізуецца праект пераводу на водазабеспячэнне з падземных крыніц, работы павінны завяршыцца ў 2022 годзе.**

**У Расійскай Федэрацыі да 70% пітной вады бярэцца з паверхневых крыніц, ва Украіне — да 80%. У многіх краінах Еўропы таксама выкарыстоўваюцца пераважна паверхневыя крыніцы.**

**Спецыялісты сцвярджаюць, што водныя рэсурсы ў нашай краіне дастатковыя для задавальнення сучасных і перспектыўных запатрабаванняў. Па інфармацыі НПЦ па геалогіі, Беларусь выкарыстоўвае толькі 20% ад выяўленых запасаў.**

## ПАДЗЕМНЫЯ СКАРБНІЦЫ

Паводле даследаванняў ПРААН, Беларусь адносіцца да катэгорыі краін са 100% доступам да бяспечнай пітной вады.

Водаправод сёння — асноўны шлях паступлення вады да карыстальнікаў. Жыхары амаль усіх населеных пунктаў краіны п'юць ваду з падземных крыніц. Выключэнне складае толькі сталіца — прыкладна 1/3 частка ад агульнага аб'ёму вады ў Мінску адбіраецца з паверхневай крыніцы (Вілейска-Мінскай воднай сістэмы) і выкарыстоўваецца ў Фрунзенскім, Маскоўскім і часткова Кастрычніцкім раёнах горада.

— Але гэта не значыць, што вада, якая там цячэ з водаправодных кранаў, брудная, — адзначае **загадчыца лабараторыі пітнога водазабеспячэння і санітарнай аховы вадаёмаў навукова-практычнага цэнтра гігіены Алена ДРАЗДОВА.** — Каб трапіць да спажыўцоў, любая пітная вада павінна адпавядаць патрабаванням санітарных нормаў і правілаў, зацверджаных Міністэрствам аховы здароўя. Вада з паверхневых крыніц проста праходзіць больш глыбокую ачыстку, чым падземная.

Акрамя выдалення хімічных забруджванняў, яна абеззаражваецца для знішчэння патагенных і ўмоўна патагенных мікраарганізмаў праз хлараванне. Астаткавая колькасць хлору ў пітной вадзе таксама рэгламентуецца — норма яго знаходжання ў спажыўца не павінна перавышаць 0,3-0,5 мг/дм³. Нягледзячы на пах і прысмак хлору ў такой вадзе, піць яе бяспечна.

Па словах Алены Драздовай, астаткавая колькасць хлору — гэта гарантыя таго, што на шляху да спажыўца (прайшоўшы 6-7 км па трубах) вада не забрудзіцца паўторна.

Фота БЕЛТА.

## ЖАЛЕЗНАЯ ПРАБЛЕМА

Павышаная колькасць жалеза і іншых кампанентаў прыроднага паходжання (марганцу, бору, фтору) — адна з асноўных праблем пітной вады ў нашай краіне. Па звестках НЦП гігіены, у палове свідравін рэспублікі, якія выкарыстоўваюцца ў якасці крыніцы пітной вады, перавышаны паказчык наяўнасці жалеза.

У Беларусі гэты нарматыў вызначаны па арганалептычнай прыкмеце шкоднасці (смак, колер, узровень мутнасці, пах) і складае 0,3 мг/л, прычым што Сусветная арганізацыя аховы здароўя дазваляе піць ваду з канцэнтрацыяй жалеза да 2 мг/л. Такая вада не прычыняе шкоды здароўю чалавека, але мае рудаватую афарбоўку.

Праблема «жалезнай» вады вырашаецца дастаткова паспяхова. Дзякуючы рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Чыстая вада», у раённых цэнтрах, аграгарадках і іншых населеных пунктах будуюцца станцыі абезжалезвання вады — сёння іх налічваецца 384.

## АДКУЛЬ У КАЛОДЗЕЖЫ НІТРАТЫ?

Сёння нецэнтралізаванымі крыніцамі водазабеспячэння карыстаюцца 1,4 млн чалавек, асноўную частку якіх (1,1 млн) складае сельскае насельніцтва. Паводле даных 2014 года, на ўліку органаў дзяржсаннагляду знаходзілася 33,4 тыс. такіх крыніц, каля 11% з іх не адпавядалі санітарным патрабаванням.

Нітраты — асноўныя забруджвальнікі неглыбокіх ваданосных гарызонтаў (калодзежаў, грунтовых вод, а таксама лясных крыніц). Гэтыя злучэнні з'яўляюцца прадуктамі раскладання адходаў жыццядзейнасці чалавека, а таксама ўваходзяць у склад мінеральных угнаенняў. Павышаная колькасць забруджвальных рэчываў рэгіструецца на глыбіні да 14-16 м.

Па словах **начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды Сяргея ЗАЎЯЛАВА,** забруджванне вады калодзежаў перш за ўсё звязана з няправільным унясеннем арганічных і мінеральных угнаенняў на палі (як індывідуальных гаспадарак, так і сельгасарганізацый), а таксама з адсутнасцю неабходнага добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі, блізкае размяшчэнне хлявоў для жывёл, аб'ектаў жывёлагадоўлі і інш.

Як расказала Алена Драздова, нітраты перш за ўсё небяспечныя для малых дзяцей. Шкодныя рэчывы ў вадзе могуць стаць прычынай развіцця метгемаглабінеміі — хваробы, падчас якой кроў страчвае здольнасць пераносіць кісларод. У дзіцяці і дарослага чалавека нітраты «дапамагаюць» знізіць імунітэт, павысіць успрымальнасць да прастудных захворванняў і нават парушыць дзейнасць крывятворнай сістэмы.

Каб засцерагчы сябе ад шкоднага ўздзеяння, уладальнікам індывідуальных калодзежаў і свідравін неабходна звяртацца ў органы санэпідэмнагляду для праверкі якасці вады.

## ЯК З ЧЫСТАЙ НЕ ЗРАБІЦЬ... ПУСТУЮ?

Нягледзячы на тое, што метады ачысткі вады ў нашай краіне паступова ўдасканальваюцца, грамадзяне таксама імкнуцца зрабіць сваю пітную ваду чыстай і карыснай. Якім жа метадам аддаць перавагу?

Па словах Алены Драздовай, кіпячэнне эфектыўнае для знішчэння мікраарганізмаў. Таму ваду з калодзежаў і свідравін рэкамендуецца заўсёды кіпяціць, асабліва калі ў сям'і ёсць малыя дзеці. Праз адстойванне вады можна пазбавіцца ад лішняга хлору ў вадзе.

Але найбольш эфектыўным метадам ачысткі сёння лічыцца фільтрацыя. Самае галоўнае тут — вызначыць, якія канкрэтныя недахопы ў вадзе патрэбна ліквідаваць: пазбавіцца ад паху і смаку хлору, зрабіць ваду больш мяккай, выдаліць узважаныя часціцы ці інш. Ад гэтага і залежыць выбар правільнага фільтра.

— Сёння няма неабходнасці ўстанаўліваць фільтры з глыбокай ступенню ачысткі, калі яны не праводзяць мінералізацыю вады, — упэўнена супрацоўнік НПЦ гігіены. — Вада пасля такой ачысткі застаецца без карысных мікраэлементаў, ператвараючыся ў «мёртвую» дыстыляваную ваду, якая не пашкодзіць, але і карысці не прынясе. А барацьба з яе жорсткасцю можа прывесці да таго, што «пустая» вада пачне вымываць солі з арганізма.

## З БУТЭЛЬКІ — ПІЦЬ ЦІ НЕ ПІЦЬ?

Калі вас не задавальняе якасць вады, можна таксама выкарыстоўваць бутыляваную ваду, як пітную, так і мінеральную (лячэбна-сталовую і лячэбную). Першую можна выкарыстоўваць без абмежаванняў. Лячэбна-сталовая стане добрым памочнікам для тых, хто хоча палепшыць сваё страваванне. Лячэбная вада прызначаецца толькі ўрачом. Лячэбна-сталовую і лячэбную ваду нельга выкарыстоўваць для спатолення смагі.

Пітная бутыляваная вада таксама мае свае віды. Больш карысная і менш апрацаваная вада павінна мець у сваёй назве тэрмін «прыродная».

## ЗАБРУДЖВАЕШ — ПЛАЦІ ШТРАФ

Парушэнне заканадаўства аб ахове і выкарыстоўванні вод можа пацягнуць як адміністрацыйную, грамадзянска-прававую, так і крымінальную адказнасць.

За забруджванне ці засмечванне паверхневых ці падземных вод фізічная асоба можа атрымаць штраф у памеры ад 4 да 20 б.в., індывідуальныя прадпрымальнікі — да 100 б.в., юрыдычныя асобы — да 500 б.в.

За паўторнае парушэнне на працягу года Крымінальным кодэксам прадугледжаны грамадскія работы, штраф або папраўчыя работы тэрмінам да двух гадоў ці арышт.

За самавольнае будаўніцтва каналаў, накапляльнікаў прыродных і сцёкавых вод, бурэнне свідравін на ваду таксама прадугледжаны штрафы ў памерах ад 10 да 30 б.в. на фізічную асобу, ад 10 да 100 б.в. на індывідуальнага прадпрымальніка і да 300 б.в. — на юрыдычную асобу.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

■ У свеце жывёл

# СТРАСЦІ ПА ПАВУКАХ

**Я заўжды з замірaннем сэрца і глыбокім задавальненнем чытаю пра наступную чупакабру ў Стаўбцоўскім раёне або еці на Браслаўскіх азёрах бо, па-першае, гэта значыць, што людзі выбраліся на прыроду, і яна ім цікавая, і, па-другое, фантазія ў людзей проста фантастычная! Але пасля «інвазіі тарантулаў» на Гродзеншчыну я вырашыў выступіць у якасці настаўніка – разбуральніка мараў. Пакуль страсці не сціхлі, сапраўдныя факты пра павукоў Беларусі могуць, я спадзяюся, абудзіць цікаўнасць крыху больш дасведчаную, чым яна ёсць зараз. Прынамсі, некаторыя «і» будуць мець свае важкія кропкі.**

**Факт першы.** Самы просты. Павукі ў нас ёсць, і іх шмат. Вельмі. На гэты момант зарэгістравана каля 500 відаў з амаль 30 сем'яў. І гэта далёка не канчатковая лічба. Напрыклад, у Польшчы зарэгістраваны больш за 800 відаў і... яшчэ больш спецыялістаў. Апошняе непазбежна вядзе да большай колькасці відаў: ведама, колькі лекараў, столькі і хваробаў...

Колькасць відаў — гэта далёка не ўсё, шматлікасць павукоў практычна ў кожным біятопе Беларусі ўражвае: напрыклад, на балотных экасістэмах яны могуць складаць да 60% усіх наземных бесхрыбетных.

Але калі павукоў так шмат, то чаму мы заўважаем значна меней? Гэта вельмі проста — многія нашы павукі маюць памеры каля 3-5 міліметраў. Па сакрэце скажу, што большасць павукоў у свеце сапраўды маленькія.

**Факт другі.** Усе павукі (за выключэннем сям'і Uloboridae, якую ў нас пакуль не знайшлі) маюць ядавітыя залозы. Гэта значыць, што на пытанне «Ці ёсць у Беларусі ядавітыя павукі?» адказ просты — так, усе. Але калі ўлічваць памер, большасць нават не здольна зрабіць хоць трохі адчувальны зашчык на скуры чалавека, не кажучы пра ўвядзенне атруты ў крывацёк.

**Факт трэці.** Правільна спытаць «Ці ёсць у Беларусі небяспечныя павукі?». Адносна чорнай удавы, карычневага павука-пустэльніка і бразільскага вандроўнага павука — не, няма. Але ў нас ёсць тарантул. Гэта праўда, на паўднёвым усходзе знаходзілі заходнерускага тарантула (Lycosa singoriensis) шмат разоў. Яго ны ўкус здольны выклікаць лакальны некроз, а ў надта адчувальных грамадзян (магчыма) алергічную рэакцыю.

Ёсць шэраг іншых відаў, якія маюць памер, дастатковы для ўкусу, але часцей за ўсё, каб падобнае здарылася, вы павінны схапіць яго ў руку і сціснуць. Да такіх відаў належаць прадстаўнікі роду Steatoda, якія (арахнафобам далей не чытаць) часта жывуць у дамах людзей, у сутарэннях і на гарышчах. Гэтыя віды належаць да той жа сям'і, да якой і чорная ўдава (Theridiidae), і маюць яд, які можа выклікаць пэўныя агульныя эфекты. Але каб дасягнуць гэтага, вам прыйдзецца моцна пастарацца самім і неяк вымусіць павука вас укусіць.

З вялікіх павукоў, здольных хоць неяк прадэманстраваць сваё права на жыццё, калі вы бераце іх на рукі, варта адзначыць усім вядомага садовага крыжавіка; вялікага сплаўнога павука (адзіны ахоўны від у Беларусі); аблямаванага паляўнічага і некаторыя віды сям'і Agelenidae (да якой належаць вядомыя «Гарадзенскія варонкавыя тарантулы»). І ў нас нават ёсць адзін павук, які належыць да «птушкаедаў», — Atypus affinis, але яго ніхто не бачыў недзе з 1930-х гадоў...

**Факт чацвёрты.** Нас не чакае нашэсця экзатычных і небяспечных павукоў. Як арахнолагу, мне вельмі хацелася б, каб гэта было так, але не лёс... Рэдкія інвазіі бываюць паспяховыя і адбываюцца ў кароткі час. Прыкладам удалага захопу тэрыторый сярод павукоў будзе

павук-аса Argiope bruennichi. Ці звязана гэта з пацяпленнем? Вельмі ўскосна. Апошнія звесткі па генетыцы сведчаць пра змяшэнне еўрапейскай і азіяцкай ліній гэтага павука, якое дазволіла павысіць разнастайнасць генетычнага матэрыялу, што, у сваю чаргу, дазволіла адаптавацца да больш халодных умоў. Цяпер павук-аса радасна захоплівае Скандынаўскі паўвостраў.

І гэта, бадай, адзіны прыклад, калі досыць вялікі павук так хутка рушыў на новыя тэрыторыі. Загадваць, ведама, не хочацца, але наступную падобную інвазію, магчыма, і не выпадзе наглядаць.

Каб падагуліць, павукоў у нас процьма і яны цікавыя, разнастайныя і збольшага бяспечныя. Але я ўсё адно буду чакаць наступнага «тарантула», жыццё з імі нейкае багацейшае.

**Вячаслаў ІВАНОЎ,**
**член грамадскага аб'яднання «Беларускае энтамалагічнае таварыства».**
**Фота аўтара.**

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# ПАЛЯЎНІЧЫЯ НА МЁД

**Як з'явіўся бортнік на беларускай зямлі?
Каб адказаць на гэтае пытанне, нам разам з вамі трэба перанесціся далёка ў мінулае, ажно на 50 мільёнаў гадоў таму, калі выраслі на планеце прыгожыя і салодкія кветкі.
Усе яны патрабавалі апылення, а пчала была адным з першых насякомых, хто пачаў гэтую вялікую працу.
Падчас апылення яна збірала і іншыя рэчывы, неабходныя ёй для існавання, — нектар і пылок.**

У Індыі вучоныя адшукалі першую «пароду» пчалы, ад якой і пайшлі ўсе астатнія. Адтуль яна пачала рассяляцца па іншых землях і дабралася да беларускіх абшараў. За доўгі час вандроўкі характар пчолкі змяніўся і стаў больш суровы — «паўночны». Пасялілася пчала ў лясах і пачала працаваць. Праз колькі гадоў з'явіліся ў тых лясах людзі. Аднойчы ў гарачае надвор'е нехта заўважыў, што па дрэве бяжыць салодкі сок, а збіраюць яго маленькія істоты. Ён вырашыў сабраць мёд голымі рукамі, за што пчолы яго пакаралі — моцна пакусалі. «Паляўнічы» прынёс здабычу і расказаў усім пра цуд: з дрэва бяжыць сок, а пчолкі яго абараняюць.

Сярэднявечны манускрыпт, захоўваецца ў Ватыкане.

Пачалі людзі даглядаць такія дрэвы ды забіраць у пчол мёд. Гэты занятак больш нагадваў паляванне без зброі (а калі б і была тая зброя, то не дапамагла б яна супраць маленькай, але ваяўнічай лясной істоты). Здабычай мёду займаліся толькі спрытныя і моцныя мужчыны, яны мусілі вельмі хутка бегаць, узлазіць на дрэва. Так і нарадзіўся ў нашых лясах (а ў іншых народаў, у скалах і пячорах) новы занятак — бортніцтва. Старадаўні лясны промысел, звязаны з доглядам дзікіх пчол у натуральных умовах іх існавання. На тэрыторыі сучаснай Беларусі гэтым рамяством займаюцца ў лясах і на балотах.

Само слова «бортніцтва» паходзіць ад праславянскага «бор», што азначае «сасновы лес» альбо «дзірка», «дупло». «Борціць» — значыць выдзёўбваць дупло ў дрэве, дзе змогуць жыць дзікія пчолы-баровкі. Мядовыя паляўнічыя завуцца бортнікамі ці вотчычамі. Першае згадванне бортніка зафіксавана не ў кніжках, а было намалявана ў павучынай пячоры Куэвас-дэ-ла-Аранья, што ў Іспаніі. Разам са сцэнамі палявання на дзікіх жывёл старажытны мастак паказаў бортніка, які збірае мёд дзікіх пчол. Так бортнік і паляўнічы апынуліся разам, бо адна справа — упаляваць жывёліну, іншая — знайсці да яе падыход. Пазней частка людзей пачала вучыцца «паляванню» толькі на мёд, паступова ператвараючыся ў бортнікаў — тых, што з года ў год клапоцяцца пра жывую істоту, якую яны не прыручылі, а з якой жывуць побач. Бортніцтва развівалася паступова і выпрацоўвала адмысловыя тэхнікі, традыцыі і абрады, прылады. Пасля гэты промысел стаў асобным відам, а бортнікі зрабіліся адасобленай групай грамадства — яны лічыліся знахарамі, варажбітамі, да іх прыходзілі раіцца па розных жыццёвых пытаннях. Лічылася, што толькі добрыя людзі могуць быць бортнікамі; акрамя таго, толькі яны могуць, як вавёрка, узлезці на вялікае дрэва без галін.

Малюнак у грабніцы Пабаса ў Фівах (каля 300 гадоў да н.э)

Сёння ўжо цяжка сказаць, што адчуваў чалавек у старажытнасці, калі здабываў цудоўны мядовы скарб. Але калі вы паспытаеце мёд сёння, то адчуеце салодкі смак мінулых стагоддзяў і мінулага лета.

**Іван ОСІПАЎ.**

**Чытайце таксама ў сёмым нумары часопіса**

**«РОДНАЯ ПРЫРОДА»:**

**— Ці выжывуць зубры без чалавека.**

**— Гаючыя ўласцівасці моху.**

**— Чаму жураўля называюць птушкай шчасця?**

Уладзіслаў ЦЫДЗІК:

■ Фотазнаёмства

# «СПЯШАЙЦЕСЯ ПАКАЗВАЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ!»

**Як спасцігнуць харство прыроды можна, адшукваючы незвычайнае, незаўважанае іншымі, так і ў прафесійнай дзейнасці толькі пастаянны рух наперад, пошук новых рашэнняў для старых пытанняў дапамогуць дасягнуць вышынь. Такімі прынцыпамі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Цыдзік кіруецца і ў працы, і ў любімым занятку — фатаграфаванні...**

Свой фоташлях Уладзіслаў Цыдзік распачаў яшчэ ў дзяцінстве. Разам з бацькам, які працаваў у лесагадавальніку, ён дапамагаў ствараць ахоўныя лесапалосы для чыгункі. Там жа адкрыў першыя таямніцы прыроды, навучыўся правільна даглядаць дрэвы, сачыць, як яны растуць, харашэюць і нясуць людзям бяспеку і прыгажосць.

Жывучы ў вёсцы, побач з прыродай, ён назіраў за паводзінамі жывёл і раслін і ўжо тады заўважаў удалыя і незвычайныя ракурсы. Так юны майстар паступова развіваў свой талент, навучыўшыся адлюстроўваць на здымках харство прыроды.

— Лянівы чалавек фатографам не стане, — упэўнены Уладзіслаў Станіслававіч. — Толькі той, хто не цураецца праблем, робіць крок за крокам наперад, можа дасягнуць поспеху ў гэтай справе.

У студэнцкія гады фотахобі на некаторы час стала і яго прафесійным заняткам — падчас вучобы ў Гродзенскім сельгасінстытуце Уладзіслаў Цыдзік быў загадчыкам фоталабараторыі, фатаграфаваў на вяселлях і іншых святах.

Ды і потым напружаная праца ў Камітэце дзяржкантролю не зменшыла любоў да фотасправы, тым больш што яго здымкі часта дапамагалі ўбачыць сапраўдны маштаб праблемы і, наадварот, заўважыць нешта добрае ў, здавалася б, бясконцай цемры.

І сёння верны сябра — фотаапарат — заўсёды з дэпутатам. Едучы па прафесійных справах у рэгіёны, Уладзіслаў Станіслававіч часта выбірае нязвыклыя, малалюдныя маршруты — яны падказваюць цікавыя сюжэты, там лепш раскрываецца чуццё фатографа. Але і звычайная лесапаласа можа ператварыцца ў казачны лес, варта толькі заўважыць, як вячэрняе сонца пачынае «іграць» у дрэвах, а выварацень, пад пільным вокам фотамайстра, аказваецца... лясной гарматай.

— Я зачараваны Беларуссю, яе прыродай, — гаворыць дэпутат. — Бо яна не проста прыгожая, яна непаўторная. І прыемна, што мне ўдаецца праз фота перадаць сваю любоў і павагу да яе, адкрыць людзям маленькі цуд, незаўважны на першы погляд.

Каб навучыцца бачыць арыгінальнае, патрэбен вопыт, упэўнены Уладзіслаў Станіслававіч. Бо з кожным крокам ты ўзнімаешся на прыступку бліжэй да прыгажосці, бачыш яшчэ больш цікавае і зноў ідзеш наперад. Так і ў прафесійнай сферы: асвоіўшы адну справу, ніколі нельга спыняцца, трэба рухацца далей.

Акрамя вырашэння надзённых праблем грамадзян, якія звяртаюцца па дапамогу да дэпутата, Уладзіслаў Цыдзік працуе і над законапраектамі ў сферы аграрнай палітыкі, у многія з якіх уваходзяць і экалагічныя пытанні. Так, у канцы чэрвеня ў другім чытанні Палатай прадстаўнікоў быў зацверджаны закон аб ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, прасочванні сельскагаспадарчых жывёл, ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі і прасочванні прадуктаў жывёльнага паходжання.





— Дакумент гэты датычыцца якасці харчавання чалавека, павышэння тэхналагічнай дысцыпліны ў дачыненні да вытворчасці харчовай прадукцыі, — адзначае Уладзіслаў Станіслававіч. — Па вялікім рахунку, яго можна назваць рэвалюцыяй у вобласці экалагічнага харчавання.

Як дэпутат і фотамайстар, ён упэўнены: кожны чалавек павінен любіць, цаніць, ахоўваць навакольны свет.

— У прыродзе ўсё прыгожа, — гаворыць Уладзіслаў Цыдзік. — Але каб гэта прыгажосць прымнажалася, мы павінны разумна падыходзіць да навакольнага асяроддзя. Прырода стварыла чалавека, і, знішчыўшы яе, мы знішчым і сябе.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

# ТУРЭЦКІ ГАМБІТ

**Турцыя зноўку апынулася ў цэнтры тэрміновых паведамленняў сусветных інфармацыйных стужак. Здаецца, «агеньчыкі», якія доўгі час тлелі, могуць разгарэцца ў небяспечнае «полымя»...**

## ПУНКТ АДЛІКУ

Тыдзень таму ў культурным цэнтры ў турэцкім горадзе Суручы адбыўся выбух. У выніку загінулі 32 чалавекі, звыш сотні атрымалі раненні. Выбуховая прылада была прыведзена ў дзеянне смяротнікам перад гарадскім культурным цэнтрам. Ахвярамі сталі галоўным чынам члены маладзёжнай арганізацыі турэцкіх курдаў, якія рыхтаваліся адправіцца ў Кобані для дапамогі ў змаганні з баевікамі ІД.

Пасля таго, як стала вядома пра тэрарыстычны акт у Суручы, сотні курдаў выйшлі на пошчу Таксім у Стамбуле, скандуючы «Эрдаган — памагаты забойцаў», паведамляе Lenta.ru. Дэманстранты заявілі, што, нягледзячы на афіцыйны ўдзел Анкары ў антытэрарыстычнай кааліцыі супраць ІД, прэзідэнт Турцыі Таіп Эрдаган і кіруючая партыя «падтрымліваюць і культывуюць гэтую экстрэмісцкую групоўку, нацкоўваючы яе на курдаў». Як вядома, тэрарыстычная арганізацыя «Ісламская дзяржава» летам 2014 года захапіла частку тэрыторый Ірака і Сірыі, абвясціўшы там халіфат. Чаму ж Турцыю, што ўдзельнічае ў антытэрарыстычнай кааліцыі супраць ІД, вінавацілі ў дапамозе ісламістам?

## ХТО І НАВОШТА?

Як толькі з Турцыі прыйшлі першыя паведамленні пра тэракт у Суручы, з'явілася мноства версій пра тое, хто яго здзейсніў і навошта. У ліку іншых праводзіліся паралелі і з нядаўнім нападам на гатэль у Тунісе, — тады ісламісты мэтанакіравана атакавалі турыстаў, спрабуючы сарваць курортны сезон у краіне.

Але неўзабаве высветлілася, што сярод 30 з лішнім загінулых і сотні пацярпелых замежнікаў не было, толькі турэцкія і курдскія сацыялісты і камуністы. У адрозненне ад Туніса, у гэтым выпадку тэрарысты не ставілі за мэту падарваць эканоміку і напалохаць турыстаў. Заязджыя іншаземцы і да сірыйскай вайны рэдка наведваліся ў Суруч: якіх-небудзь выдатных цікавінак у горадзе няма, дабірацца туды доўга. Мясцовыя ўлады, разумеючы слабую турыстычную прывабнасць рэгіёна, нават не паклапаціліся аб тым, каб перакласці інфармацыю пра горад хоць на якую замежную мову. Як адзначаюць спецыялісты, відавочна, што тэракт у Суручы не паўплывае на турыстычныя плыні. Паводле афіцыйных звестак, летась Турцыю наведалі каля 40 мільёнаў турыстаў, прычым іх колькасць апошнім часам стабільна павялічваецца — пагадзіцеся, надзвычай перспектыўная галіна эканомікі, якую нельга ставіць пад удар. Зноў-такі пытанні...

## ЗВАЛІСЯ БРАТАМІ...

Для таго, каб падабрацца да адказаў, варта ацаніць становішча, што называецца, «на месцы». Справа ў тым, што турэцкі Суруч знаходзіцца ўсяго ў дзесяці кіламетрах ад сірыйскага Кобані, за які з верасня 2014-га па студзень 2015 года ішлі працяглыя баі: атрады «Ісламскай дзяржавы» штурмавалі горад, ператвораны тамтэйшымі курдамі ў сапраўдную крэпасць. Бітва скончылася разгромам і адступленнем ісламістаў. У Суручы, дзе знайшлі часовы прытулак дзясяткі тысяч сірыйскіх бежанцаў, Федэрацыя асацыяцый сацыялістычнай моладзі праводзіла прэс-канферэнцыю па пытаннях аднаўлення інфраструктуры Кобані. Калі ўдзельнікі сустрэчы выйшлі ў парк культурнага цэнтра, каб сфатаграфавацца, спрацавала выбуховая прылада.

Турэцкія ўлады назвалі вінаватых практычна адразу. Прэм'ер Ахмет Давутаглу заявіў: за тэрактам стаіць «Ісламская дзяржава», якая выкарыстала смяротніка. Прэзідэнт Рэджэп Таіп Эрдаган выказаў спачуванні сем'ям ахвяр тэракта. Словы Эрдагана сваякоў і сяброў загінулых не задаволілі: менавіта складаныя палітычныя гульні турэцкага прэзідэнта прывялі да таго, што ў прымежных гарадах грукочуць выбухі.

Да «арабскай вясны» зносіны Анкары і Дамаска былі надзвычай цёплымі. Турцыя, якая прэтэндуе на ролю рэгіянальнага лідара, спрабавала з дапамогай рэжыму Асада павялічыць свой уплыў у арабскім свеце. У тым ліку зарабіць аўтарытэт на ўдзеле ва ўрэгуляванні палесцінскага пытання: улічваючы, што ў той момант штаб-кватэра ХАМАС знаходзілася ў Дамаску, зрабіць гэта можна было толькі праз Сірыю. У сваю чаргу сірыйцы імкнуліся праз туркаў паслабіць ролю Саудаўскай Аравіі і націснуць на Ізраіль, каб вярнуць сабе Галанскія высоты і атрымаць «бонусы» ад развязкі той жа палесцінскай праблемы. Рука ў руку з палітыкай ішла і эканоміка: Турцыя атрымлівала з Сірыі тавары лёгкай прамысловасці, у сваю чаргу пастаўляючы электрычнасць, патрэбную для развіцця сірыйскай эканомікі. Апроч таго, Эрдаган і Асад падтрымлівалі цесныя асабістыя адносіны: лідары сябравалі сем'ямі, нярэдка разам праводзілі адпачынак і нават звалі адзін аднаго братамі.

## ВЯСНА ПЕРАМЕН

«Арабская вясна» выклікала ў Турцыі шок: рэжымы ў арабскіх краінах, што сыплюцца, быццам картачныя домікі, вымусілі Анкару тэрмінова перагледзець сваю знешнеапалітычную стратэгію. Ва ўмовах цэйтноту і блытаніны туркі рэагавалі на падзеі, якія разгортваліся, са спазненнем, у выніку саступіўшы Лівію і Егіпет сваім сапернікам — саудаўцам і Катару. Але да моманту, калі хваля «арабскай вясны» дакацілася да Сірыі, турэцкія палітыкі ўжо змянілі прыярытэты і выпрацавалі, як ім здавалася, дакладную стратэгічную лінію: стаўку на ўмераных сунітаў-ісламістаў, зацікаўленых у рэалізацыі «турэцкай мадэлі» і арыентаваных на саюз з Анкарой.

Пасля таго, як туркі не здолелі пераканаць Асада дапусціць да ўлады ўмераных ісламістаў, Анкара пачала супраць сірыйскага рэжыму неабвешчаную вайну. Турцыя скарыстала сваё геаграфічнае становішча: менавіта праз яе тэрыторыю ў Сірыю галоўным чынам ідуць зброя і папаўненне для апазіцыі. Анкара падтрымлівала ўмеранае Сірыйскае вольнае войска: яе баевікі трэніраваліся ў лагерах на турэцкай тэрыторыі, турэцкія інструктары кіравалі дзеяннямі атрадаў СВВ.

Аднак рэжым Асада аказаўся мацнейшым, чым меркавалася, і турэцкая стратэгія забуксавала. Як лічыць прэзідэнт Інстытута Блізкага Усходу Яўген Сатаноўскі, Анкара расчаравалася ў сваіх саюзніках з СВВ. «Рэжым Рэджэпа Таіпа Эрдагана вырашыў, што ўрад Башара Асада абваліцца, і Турцыя разам з Саудаўскай Аравіяй і Катарам хутка падзеляць здабычу. У Сірыі Турцыя павінна была атрымаць газаправод, нафтаправод і, мабыць, частку краіны. Замест гэтага Эрдаган атрымаў грамадзянскую вайну ў суседзяў і пару мільёнаў бежанцаў на сваёй тэрыторыі. І цяпер туркі робяць стаўку на саміх сябе, таму што іх стаўка на Сірыйскае вольнае войска правалілася, а мары пра тое, што яны скаардынуюць дзеянні з Саудаўскай Аравіяй і Катарам і ў выніку баявыя атрады апазіцыі перастануць адзін аднаго забіваць, так і засталіся марамі», — заўважае эксперт.

## БЕЗ ІНТЭРВЕНЦЫІ?

У гэтай сітуацыі Дамаск умудрыўся нават здзейсніць контрудар, аднавіўшы падсілкоўванне грашамі і зброяй Працоўнай партыі Курдыстана і шыіцкіх арганізацый у Турцыі. Але найбольш паспяховым ходам сірыйскіх улад стала прадастаўленне курдам шырокай аўтаноміі, што аўтаматычна ператварыла іх у саюзнікаў рэжыму ў змаганні з ісламістамі, паставіла заслон на шляху магчымага турэцкага ўварвання, а заадно стварыла для Турцыі крыніцу пастаяннага галаўнога болю. У выніку ідэя турэцкай інтэрвенцыі, якая ўсплыла яшчэ пару гадоў таму, памерла сама сабой. Прынамсі, на той час. Простае ўварванне на населеныя і кантраляваныя курдамі землі азначала б зацяжную партызанскую вайну, якая хутка перакінулася б на тэрыторыю самой Турцыі.

Па словах старшага навуковага супрацоўніка Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН Віктара Надзеіна-Раеўскага, Турцыя асцерагаецца ў адкрытую ўжываць сілу супраць якога-небудзь з бакоў у сірыйскай вайне. «Анкара даўно хацела б уцягнуцца ў сірыйскі канфлікт, — кажа эксперт, — але адна не гатова ўмешвацца, а для ўдзелу ў міжнароднай аперацыі Турцыя выстаўляе ўмову — прыбраць рэжым Асада. Толькі тады Анкара будзе гатова змагацца з баевікамі ІД. Пакуль гэта ўмова не выканана, Турцыя не хоча далучацца да антыісламісцкіх дзеянняў». З ім згодны і Яўген Сатаноўскі: «Вайсковае ўварванне магчымае толькі пры падтрымцы ЗША, у тым выпадку, калі Злучаныя Штаты пачнуць інтэрвенцыю, прытым адначасова будуць ваяваць і супраць ІД, і супраць Асада. Ні ў якім іншым варыянце гэта немагчыма. А якраз супраць ІД туркі зусім не ваююць».

## НА ДВА ФРАНТЫ

Але зусім хутка сітуацыя заўважна змянілася. Некалькі дзён таму турэцкія знішчальнікі-бамбардзіроўшчыкі F-16 здзейснілі новыя авіянапады па пазіцыях баевікоў «Ісламскай дзяржавы» ў Сірыі, а таксама атакавалі пазіцыі курдскіх апалчэнцаў, якія супрацьстаяць ісламістам на поўначы Ірака. Самалёты выляталі з авіябазы ў правінцыі Дзіярбакыр. Па афіцыйнай версіі, гэта стала адказам на памежны інцыдэнт у раёне Кіліса. З падкантрольнай ІД тэрыторыі Сірыі быў адкрыты агонь па турэцкім памежным пасту, у выніку чаго загінуў афіцэр.

Яшчэ адна важная дэталь — стала вядома, што Турцыя пагадзілася прадаставіць амерыканскім ВПС сваю авіябазу Інчырлік для нанясення авіянападаў па пазіцыях «Ісламскай дзяржавы». Гэтую інфармацыю афіцыйна пацвердзіла МЗС Турцыі. Пагадненне пра выкарыстанне амерыканскай авіяцыяй базы ў Інчырліку было пацверджана падчас тэлефоннай гутаркі паміж прэзідэнтамі ЗША і Турцыі.

Курды пасля налётаў турэцкай авіяцыі абвясцілі пра заканчэнне шматгадовага перамір'я з Турцыяй. Анкара ж працягвае масавыя арышты экстрэмістаў і абяцае не спыняць бамбавання пазіцый тэрарыстаў «Ісламскай дзяржавы» і курдаў, якія ваююць супраць іх.

Анкара напрыканцы мінулага тыдня ўпершыню з вясны 2013 года, калі быў абвешчаны мараторый на вайсковыя дзеянні паміж Турцыяй і курдскімі паўстанцамі, выкарыстала вайсковую сілу супраць курдаў. Цікава, што заключэнню перамір'я папярэднічалі цяжкія перамовы, якімі кіраваў Рэджэп Таіп Эрдаган, тады прэм'ер-міністр Турцыі.

Таксама паведамляецца, што ўлады Турцыі правялі серыю рэйдаў, падчас якіх былі затрыманы некалькі сотняў чалавек. Толькі ў Стамбуле больш за пяць тысяч паліцэйскіх і супрацоўнікаў спецслужбаў абшукалі 140 дамоў і кватэр. Ператрусы і арышты прайшлі таксама ў Анкары і Ізміры, а таксама ў правінцыі Санліурфа, што на мяжы з Сірыяй. Большасць затрыманых падазраюцца ў дачыненні да ІД, аднак, па паведамленнях СМІ, сярод іх ёсць неназваная колькасць членаў абвешчанай па-за законам Курдскай працоўнай партыі і леварадыкальнай групоўкі Марксісцкая рэвалюцыйная партыя вызвалення.

Пра спыненне перамір'я абвясціла забароненая ў Турцыі Працоўная партыя Курдыстана (ППК): «Перамір'е з гэтага часу пазбаўлена сэнсу, улічваючы авіянапады, нанесеныя войскамі турэцкіх акупантаў». У паведамленні, якое цытуюць інфармагенствы, таксама сказана, што ППК ва ўзніклых абставінах мае права «абараняцца і наносіць зваротны ўдар». Як вядома, узброены канфлікт паміж курдамі, якія змагаюцца за стварэнне незалежнай дзяржавы, і Турцыяй доўжыцца больш 30 гадоў, яго ахвярамі сталі больш за 40 тысяч чалавек.

І — новае паведамленне. Двое вайскоўцаў турэцкай арміі загінулі ў выніку тэракта, здзейсненага на паўднёвым усходзе краіны. Яшчэ чацвёра атрымалі раненні. Пра гэта паведамляе Reuters. Па словах прадстаўнікоў Турцыі, інцыдэнт адбыўся ў ноч на 26 ліпеня ў правінцыі Дзіярбакыр, большасць насельніцтва якой складаюць курды. У той час, калі па адной з мясцовых дарог праязджаў вайсковы канвой, паблізу яго выбухнуў замініраваны аўтамабіль.

## ЭКСТРАННЫ СХОД

Цікавая рэакцыя на падзеі па той бок Атлантыкі: амерыканскі дыпламат Брэт Макгерк, каментуючы ў Twitter напружаныя адносіны паміж Працоўнай партыяй Курдыстана і Анкарой, падкрэсліў, што «авіянапады па пазіцыях ППК ніяк не звязаны з апошнімі дамоўленасцямі пра актывізацыю супрацоўніцтва паміж ЗША і Турцыяй для змагання з «Ісламскай дзяржавай».

І, напэўна, апошні інфармацыйны «пазл» у агульны «калейдаскоп». Турцыя выступіла з ініцыятывай аб правядзенні экстраннага сходу пасланнікаў краін НАТА, каб абмеркаваць каардынацыю баявых дзеянняў супраць баевікоў групоўкі «Ісламская дзяржава» і курдскіх сепаратыстаў. Сустрэча мае адбыцца сёння ў Бруселі. Як адзначыў ВВС генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг, Анкара скарысталася Чацвёртым артыкулам Паўночнаатлантычнага дагавора, які дае членам арганізацыі права збіраць нараду саюзнікаў у выпадку пагрозы сваёй бяспецы ці тэрытарыяльнай цэласнасці.

**Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*litvinov@zviazda.by*

# «СЕРАБРО» НА ПЯСКУ

**Беларуская зборная па пляжным футболе заваявала «серабро» на міжнародным турніры «Кубак дружбы-2015», які прайшоў у Віцебску. Наш зямляк Іван Канстанцінаў прызнаны лепшым гульцом.**

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Падчас турніру.

Сёлета ўпершыню спаборніцтвы былі ўключаны ў афіцыйны каляндар ФІФА. Гэта, зразумела, сведчыць пра высокі ўзровень арганізацыі. За перамогу змагаліся гульцы з Беларусі, Турцыі, Ірана і Эстоніі. Апошнія ўпершыню выйшлі на віцебскі пясок.

Мноства гледачоў падчас гульні за «золата» вельмі актыўна падтрымлівалі беларускую каманду. Але перамаглі іранцы. Дарэчы, менавіта прадстаўнікі гэтай краіны ўжо трэці год запар становяцца ў Віцебску залатымі прызёрамі. Нашы землякі выйгралі самы першы турнір, які адбыўся ў 2010 годзе, і сталі пераможцамі ў 2012-м...

Як ні дзіўна, сёлета каманда з Турцыі, вядомай сваімі пляжамі, стала аўтсайдарам турніру.

Па добрай традыцыі адбыўся сяброўскі матч каманды «зорак» эстрады, тэлебачання, ветэранаў футбола супраць зборнай свету.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Напярэдадні

# БАТЭ ЧАКАЮЦЬ ВЕНГРЫ

**Любімая каманда прэм'ер-міністра, якая перамагала сам мадрыдскі «Рэал». Карэспандэнт «Звязды» пастараўся сабраць разам самыя цікавыя факты пра чарговага саперніка БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў.**

Пасля даволі няпростага супрацьстаяння ў другім кваліфікацыйным раўндзе Лігі чэмпіёнаў з ірландскім «Дандалкам» барысаўскаму БАТЭ прыйдзецца сустракацца з чэмпіёнам Венгрыі «Відэатонам» з Секешфехервара — матч адбудзецца сёння.

**Гісторыя.** «Відэатон» заснавалі ў далёкім 1941 годзе пры прадпрыемстве, якое вырабляла кулі для паляўнічых. Сваёй сучаснай назвай ён абавязаны аднайменнаму вытворцу электронікі, штаб-кватэра якога знаходзіцца ў 99-тысячным Секешфехервары. Яе клуб атрымаў толькі ў 1968 годзе. Менавіта тады каманда правяла першы сезон у элітным дывізіёне першынства Венгрыі. У вышэйшай лізе каманда ўсяго правяла 46 сезонаў, двойчы перамагала ў чэмпіянаце і аднойчы заваёўвала кубак краіны. Але галоўным дасягненнем каманды лічыцца ўдзел у фінале Кубка УЕФА ў 1985 годзе. «Відэатон» здолеў прайсці французскі ПСЖ, югаслаўскія каманды «Партызан» і «Жэлезнічар», англійскі «Манчэстэр Юнайтэд», але саступіў у фінале мадрыдскаму «Рэалу» (0:3, 1:0).

Цікава, што галоўным заўзятарам каманды з'яўляецца прэм'ер-міністр Венгрыі Віктар Орбан, які нарадзіўся ў Секешфехервары. У свой час ён нават выступаў за каманду «Фельчут» з трэцяй венгерскай лігі.

**Трэнер.** 10 чэрвеня галоўным трэнерам «Відэатона» стаў француз Бернар Казані. Як футбаліст ён двойчы станавіўся чэмпіёнам Францыі, пераможцам Лігі чэмпіёнаў у складзе «Марсэля». Правёў 30 матчаў за нацыянальную каманду. Казані гуляў выключна ў Францыі, а вось трэніраваць яму давялося і за межамі радзімы. У свой час ён узначальваў тры туніскія каманды і нават зборную Арменіі.

**Гульцы.** Пра ўзровень гэтага калектыву сведчыць тое, што амаль кожны венгерскі футбаліст гэтай каманды мае вопыт выступленняў за зборную. Сярод іх ёсць і тыя, хто ўжо гуляў у Барысаве. Гэта тычыцца і абаронцы Роланда Юхаса, які прыязджаў у горад над Бярэзінай разам з бельгійскім «Андэрлехтам» у 2008 годзе, і фактурнага нападаючага Роберта Фецэшына. У Барысаве Роберт гуляў за маладзёжную зборную Венгрыі супраць беларускіх аднагодкаў. Ёсць у «Відэатоне» і даволі нядрэнныя легіянеры. Абаронца Рэмі Марэвал правёў каля сотні матчаў за вядомы французскі «Нант», Артура Альварэс з'яўляецца віцэ-капітанам зборнай Сальвадора, Мірка Іваноўскі згуляў больш 20 матчаў за нацыянальную каманду Македоніі, а партугалец Філіпэ Алівейра наогул выступаў за лонданскі «Чэлсі».

Дарэчы, «Відэатон» і Беларусь звязвае не толькі супрацьстаянне з БАТЭ. Даволі працяглы час за каманду выступаў паўабаронца Д'ёрдзь Шандар, у якога ў нашай краіне жывуць сваякі па матчынай лініі. А яго родны брат Іштван нават адзначыўся матчамі ў нашым чэмпіянаце. Выступаў ён за наваполацкі «Нафтан».

**Сувязі.** Лёсаванне Лігі чэмпіёнаў ужо падкідвала БАТЭ венгерскі «Дэбрэцэн». «Жоўта-блакітныя» сустракаліся з імі ў дзвюх кваліфікацыях і двойчы праходзілі венграў. Спадзяёмся, сёлетні венгерскі апанент таксама не стане для БАТЭ перашкодай.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

■ Сталічны час

# 200 ІДЭЙ ДЛЯ ЛЮБІМАГА ГОРАДА

## паспрабуюць рэалізаваць мінчане і атрымаць грашовы прыз

**— Абышоўшы з жонкай увесь наш раён, мы знайшлі толькі дзве пляцоўкі для выгулу сабак: адну абсталяваў ЖЭС, другую — жыхары, праўда, павесіўшы на яе замок, — расказвае гаспадар двух сабак Аляксандр БУЯН. Мужчына гаворыць, што праз адсутнасць спецыяльнага месца не можа выпусціць сваіх гадаванцаў нават проста пабегаць, не кажучы ўжо пра заняткі з кінолагам. Аднак Аляксандр не стаў чакаць, пакуль ЖЭС вырашыць яго праблему, а сабраў каманду аднадумцаў і выступіў з ідэяй абсталяваць у Мінску пляцоўкі для выгулу сабак на рэаліці-конкурсе #РазамМінск.**

Паўдзельнічаць у конкурсе могуць усе актыўныя мінчане, у якіх ёсць ідэі для развіцця свайго горада і паляпшэння жыцця яго жыхароў у розных сферах: экалогія, культура, адукацыя, музыка, спорт, тэхналогіі, даступнасць і г.д. Прызавы фонд конкурсу — 30 млн рублёў (два лепшыя праекты могуць атрымаць па 15 млн па выніках адзнак журы і гледачоў, прычым гэтыя сімпатыі могуць супасці, а значыць, адзін пераможца можа выйграць 30 млн).

У экскурсавода Паўла Дзюсекава ёсць ужо фактычна рэалізаваны трохгадовы праект, які называецца «Вандроўкі ў мінулае». У яго межах Павел распрацаваў 7 аўтарскіх маршрутаў, па якіх водзіць усіх ахвотных.

На думку Паўла, мінчукі не ведаюць горада, у якім жывуць, яго гісторыі, тапанімікі, мінулага, праз гэта не ўяўляюць яго ўнікальнасці і каштоўнасці. Таму ёсць патрэба ў стварэнні паўнавартаснага праекта «Free Walking Tours», які на беларускай, рускай, англійскай мовах зможа расказаць жыхарам Мінска і замежным гасцям аб нашай сталіцы. Гэта будуць бясплатныя пешыя экскурсіі, напрыканцы якіх пры жаданні можна будзе ўнесці ахвяраванні на развіццё праекта.

— Калі мой праект пераможа, за выйгрыш я набуду два дэвайсы. Першы — гэта «гаварылка» (спецыяльны мікрафон. — **Аўт.**), бо калі збіраецца шмат людзей, пачуць экскурсавода бывае праблемай. Таксама мару набыць добры планшэт, каб адысці ад традыцыі савецкіх экскурсаводаў цягаць з сабой папкі з ілюстрацыямі, — дзеліцца Павел.

У кожнага праекта ёсць свой блог у інтэрнэце, дзе выкладаюцца ўсе этапы яго рэалізацыі. Барацьба за перамогу абяцае быць цікавай, бо праекты абсалютна розныя і патрабуюць розных матэрыяльных, фізічных і псіхалагічных рэсурсаў. Так, сярод зарэгістраваных прапаноў стварэнне карты безбар'ернага асяроддзя — спецыяльнага «бэбі-таксі», каляровага інтэрфейсу ў метро для лепшай арыентацыі дзяцей у падземцы і цэлая экалагічная місія па ратаванні качак на вадаёме ва Уручы...

Каманды, якія за месяц паспяхова завершаць свае мініпраекты, пазмагаюцца за прызы ў чатырох намінацыях: «Лепшы гарадскі праект», «Выбар мінчан», спецыяльная намінацыя Talaka.by «Сацыяльны прадпрымальнік» і спецыяльная намінацыя кампаніі velcom «Дзіцячы горад». Пераможцы рэаліці-конкурсу #РазамМінск будуць абвешчаныя 16 верасня.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*
**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**


Закрытое акционерное общество
**«ДЕЛЬТА БАНК»**

220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 72
www.deltabank.by

ДЕЛЬТА БАНК


## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2015 | 01.07.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 38 539 | 152 043 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 567 480 | 327 288 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 35 797 | 374 004 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 90 223 | 302 940 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 232 574 | 1 858 963 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 12 428 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 156 | 1 156 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 178 067 | 165 813 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 19 522 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 101 914 | 89 954 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 2 265 272 | 3 284 589 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 988 | 25 082 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 96 086 | 380 043 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 719 935 | 2 412 215 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 74 112 | 17 511 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 6 181 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 1 866 633 | 25 305 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 2 757 754 | 2 866 337 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 261 380 | 261 380 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 21 492 | 20 291 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 36 934 | 35 520 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | (812 288) | 101 061 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | (492 482) | 418 252 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 2 265 272 | 3 284 589 |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 июля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2015 | 01.07.2014 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 275 458 | 379 350 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 231 671 | 330 403 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 43 787 | 48 947 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 82 115 | 105 342 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 7 228 | 11 461 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 74 887 | 93 881 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (42) | (1 215) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (1 119) | 3 768 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (8 168) | (325) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 1 122 568 | 43 752 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 276 233 | 38 149 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 85 047 | 109 343 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 13 033 | 8 245 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | (835 070) | 21 865 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 | 3 206 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | 2 | **(835 071)** | **18 659** |

Заместитель генерального директора
Государственного учреждения
«Агентство по гарантированному
возмещению банковских вкладов (депозитов)
физических лиц» — управляющего
в деле о банкротстве ЗАО «Дельта Банк» Педько А.В.

Главный бухгалтер Грибанова Е.М.

УНП 807000015

## У Мінску адкрыецца парк дыназаўраў

На тэрыторыі Мінскага заапарка пад адкрытым небам 31 ліпеня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё «ДынаПарка». У ім «прапішуцца» больш як 30 фігур дыназаўраў, прычым у натуральную велічыню: экспанаты будуць рухацца, міргаць, дыхаць і рыкаць. Цырымонія адкрыцця «ДынаПарка» адбудзецца ў 12.00, гасцей свята чакае святочны канцэрт.

**Надзея ІЛЬЯШУК,**
*«Мінск—Навіны».*

■ Знаходка для вандроўніка

# «ЗЯМЛЯ НЯЗНАЕМАЯ» ЧАКАЕ АДКРЫЦЦЯ

**З той пары, як зрабілася модным вандраваць па Беларусі, сёе-тое ў дапамогу падарожнікам было зроблена. Ледзь не кожная паважаная газета займела «падарожную» рубрыку з выкладаннем маршрутаў. Толькі самы лянівы турыстычны гарадок не выпусціў паштовак і картаў з указаннем культурных аб'ектаў. Толькі самы нядбайны турыст не завёў сабе навігатар. І вы думаеце, кожны беларус адкрыў для сябе Беларусь?**

Як і ў кожнага падарожніка, у архітэктара і дызайнера Уладзіміра Цвірко захапленне вандроўкамі пачыналася сціплымі дзвюма-трыма гадзінамі фотапалявання на культурна-гістарычныя вабноты.

*— Але калі пасля такіх вылазак я паказваў фотаздымкі сябрам і знаёмым, яны здзіўляліся: «Ты дзе такое бачыў?». Калі прывёз фотаздымкі з Дрывятаў, мне сказалі: «Гэта, брат, не Беларусь, а Літва або Польшча». Далібог, стала крыўдна. Калі тыя самыя сябры самі выпраўляліся ў вандроўку, я па вяртанні пытаўся: «Ну, дзе былі? Што бачылі?». Адказы чуў стандартныя, тыпу: «У Нясвіжы». «А вы па дарозе туды і туды заязджалі?» — «Не». І мае сябры-падарожнікі пасля размовы са мной выпраўляліся ў новую вандроўку! І па вяртанні ўжо канстатавалі: «Валодзя, не паверыш. Ехалі ў Нясвіж, але не даехалі. І столькі ўсяго паглядзелі! Гэта фенаменальна, звыш, супер, клас!»*

Яго моцна чапляла тое, што пры шчырым жаданні ўбачыць прыгажосць і веліч Беларусі турысты-беларусы едуць у «раскручаныя» месцы і не бачаць, што ляжыць на гэтым шляху ў іх пад нагамі. За пагорак завярнуць не здагадаліся. Паўз могілкі прайсціся — фантазіі не хапіла. Сапраўды, вяртанне з падарожжа, у якім большая палова цікавінак была папросту прапушчана толькі таму, што пра іх нічога не было вядома, а потым, калі ўжо і час, і паліва беззваротна загублены, раптам пра іх даведацца, — неверагодна крыўдна. Бачыць на фотаздымку тое, што лічаныя гадзіны таму можна было назіраць увачавідкі, — літаральна ўводзіць у шокавы стан. Гэтыя акалічнасці падштурхнулі падарожніка Уладзіміра Цвірко да распрацоўкі маршрутаў па абласцях і стварэння серыі брашур «150 залатых маршрутаў маёй Беларусі». У кожнай брашуры — дзевяць пунктаў, якія немагчыма прапусціць, з фотаздымкамі і апісаннем.

*— Над Мінскай вобласцю я працаваў як на выпрабавальным палігоне. Праязджаў, глядзеў, здымаў, запісваў, потым зноў праязджаў, па-новаму: на адны і тыя аб'екты імкнуўся паглядзець вачыма розных людзей з розных месцаў. Не ўсё ж нам ад Мінска як ад пупа зямлі мераць. Падарожнік можа ехаць з боку Брэста, або Гродна, або Віцебска. Мне раілі: трэба, маўляў, выкладаць маршруты. Але ж ёсць карты, сродкі навігацыі. І рэдкі аб'ект не пазначаны каардынатамі. У майго праекта іншая мэта: каб падарожнік адкрыў брашурку — і меў выбар. Напрыклад, прапанаваны маршрут складаецца з дзевяці пунктаў, а ён сабе можа сказаць: «Я ахаплю толькі шэсць. Або тры». Гэта праект для падарожнікаў-аўтамабілістаў, а не турыстаў, прывязаных да аўтобуса і экскурсавода, без права ўплыву на маршрут.*

**Беларусы едуць у «раскручаныя» месцы і не бачаць, што ляжыць на гэтым шляху ў іх пад нагамі.**

Чаму 150? Проста лічба прыгожая. На дзевяць, праўда, яна не дзеліцца. Проста аўтару праекта вельмі хацелася, каб было так: прыязджаеш у рэгіён — і не вылазіш з яго, пакуль усё не пераглядзіш, не перамацаеш, не перафатаграфуеш. І пасля дакладна можаш хваліцца, што ў гэтай мясцовасці бачыў усё. Як такога дасягнуць? Выдатны дапаможнік Анатоля Федарука прадстаўляе выключна сядзібы. У вычарпальным «Глобусе Беларусі» Андрэя Дыбоўскага — не тая сістэма. Хацелася стварыць прадукт для практычнага ўжытку. Літаральна. Нават памер меркаваўся ад гэтага.

**Асновай для серыі брашур Уладзіміра ЦВІРКО стаў друкаваны праект «У пошуках скарбаў» (газета «7 дней»), які атрымаў сёлета «Залатую літару».**

*— У выдавецтвах мне прапаноўвалі выпусціць фаліянт. Усё самае цікавае і прыгожае пад адной вокладкай. Але ж трэба разумець, што гэта не для падарожніка прадукт. Гэта нешта бібліятэчнае, сувенірнае, падарункавае. На паліцу паставіць, замежніку ўручыць. Турызм фаліянтамі не разаўеш.*

Да кожнага маршруту Уладзімір Цвірко піша легенду. Сябры прачыталі неяк яго гісторыю пра кульгавую кабылу — і пытаюцца: «Ну скажы, ці праўда так было?» Ён ім адказвае: «Ды не важна». А гэтая «Кульгавая кабыла» нарадзілася ў яго з двух слоў. Ён прычапіўся да аднаго чалавека, што жыў ля млына, з пытаннем, што з тым млыном звязана. Мо якая містычная гісторыя, мо... «Ды ну цябе, — кажа той. — Млын як млын, адчапіся». — «Няўжо і кахання ніякага няшчаснага не здаралася?» — не спыняўся Уладзімір. «Ды нічога не здаралася! Жыла толькі кульгавая кабыла».

*— Але гэта ўжо іншае пытанне,* — мяняе тон размовы Уладзімір. *— Якая перад вамі легенда разгорнута?*

Адказваю, зазірнуўшы ў брашурку: «Парог з засечкамі».

*— А, гэта пра пярэваратняў. Іх дзіцятка ў ваўчаня ператварылася...*

**Святлана ДЗЯНІСАВА**

■ На рамантычнай хвалі

# Мемарыяльная дошка — на месцы вянчання Якуба Коласа

**На званіцы Свята-Варварынскай царквы ў Пінску з'явілася дошка ў памяць аб шлюбе беларускага Песняра.**

Месца вянчання Канстанціна Міцкевіча і Марыі Каменскай доўгі час заставалася невядомым. Раскрыць таямніцу дапамог выпадак. У адным са сваіх інтэрв'ю архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан абмовіўся, што ў пінскім храме ў метрычнай кнізе захаваўся запіс аб заключэнні шлюбу паміж Канстанцінам Міхайлавічам і Марыяй Дзмітрыеўнай. Сваякі пісьменніка звярнуліся ў Пінскі гарвыканкам з просьбай дапамагчы знайсці гэты важны дакумент.

— Кожная нацыя мае сваіх герояў, якія рабілі ўсё магчымае для станаўлення свайго народа, — адзначыў архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан падчас цырымоніі адкрыцця памятнай дошкі. — Для рускіх — Аляксандр Пушкін, для ўкраінцаў — Тарас Шаўчэнка, для беларусаў — гэта Якуб Колас. Мы можам ганарыцца тым, што вялікі сын зямлі беларускай пражыў пэўны час на Піншчыне. Гасподзь даў нам магчымасць адкрыць архіўныя дакументы, якія сведчаць аб тым, што менавіта ў гэтай царкве Канстанцін Міцкевіч пабраўся шлюбам з Марыяй Каменскай, пасля чаго паўстала вельмі моцная сям'я.

**Вера МІЦКЕВІЧ запрашае сфатаграфавацца каля памятнай дошкі з архіепіскапам Пінскім і Лунінецкім Сцяфанам.**

Нагадаем, у Пінску Якуб Колас правёў тры гады: з 1912-га па 1915-ы. Тут заклаўся падмурак ягонай сям'і: пісьменнік сустрэў настаўніцу Марыю Каменскую, з якой ажаніўся ў 1913 годзе і пражыў у шлюбе больш за 30 гадоў. У горадзе на Піне нарадзіўся першы сын Якуба Коласа — Даніла. Менавіта Піншчына натхніла Песняра напісаць трылогію «На ростанях».

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел аматары творчасці Якуба Коласа, яго родныя — нявестка Аляўціна Цімафееўна Міцкевіч і дзве ўнучкі — Вера Данілаўна і Марыя Міхайлаўна. Мемарыяльную дошку на званіцы асвяцілі, затым госці і сваякі пісьменніка наведалі Музей беларускага Палесся і коласаўскія мясціны на Піншчыне.

**Надзея ПАЎЛАВА**

■ Выстава

# ВЯЗЫНКА. МУЗА

## Радзіма Купалы натхняе на фотаздымкі

**Пра тое, што тут выдатна фатаграфавацца, ведаюць тыя, хто наведваў ці любіць наведваць Вязынку. Але тады яна ўсё ж на другім плане. У фотамастака Валерыя Вядрэнкі, наадварот, — Вязынка на першым месцы, на першым плане, і фактычна муза — ужо другі фотапраект прысвячае ён мясцінам Купалы. Як і першы, гэты прадстаўляе Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, дзе да 15 жніўня працуе выстава «Святло Вязынкі. Графіка».**

Можна здзіўляцца: ну як можна столькі здымкаў прысвяціць толькі аднаму аб'екту? Можна, прычым на кожным з іх гэты аб'ект паўстае іншым, загадкавым, невядомым, прывабным, фантастычна-прыгожым, рамантычна-паэтычным, знакавым... Так і ёсць. Але не ўсе гэта могуць убачыць, а вось фатограф Валерый Вядрэнка можа падкрэсліць усе асаблівасці аднаго месца. Ён наогул любіць здымаць асобныя архітэктурныя помнікі, гарады ці мястэчкі, гістарычныя комплексы, якім часам прысвячае тэматычныя выставы. Пра яго працы, прысвечаныя адметнасцям Беларусі, мы ўжо пісалі. Але цяпер чарговы праект. Не, хутчэй усё ж працяг адкрыцця Вязынкі, якая падаецца і з розных ракурсаў і з асаблівым падыходам.

